ЦАНА НУМ

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дарновым дадаткам „Прафрух")

На 1 мес. . . . — 90 к.
„ 3 мес. . . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . . 5 р. —
„ 12 мес. . . . 9 р. 75 к.

За радок Іншагароднія аб... Пасярод тэксту—у два... Пры шматразовым друкаванні... ка. Звыш тарыфу, згодна пастанове СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. -надбаўкі.

Падпіска і абвестні прыймаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

Москва, Б-ка ВНХ СССР
Экспл. студ. экспл.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
» абвестак . . 7-81

СУБОТА, 13 верасьня 1930 г.
№ 214 (3052)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

Па-бальшавіцку выканаць баявую задачу

XVI зьезд нашай партыі высунуў, як баявую задачу на бліжэйшы пэрыяд—увядзеньне ўсеагульнага абавязковага навучаньня і ліквідацыю няпісьменнасьці.

Ва ўмовах разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце пытаньні культурнай рэвалюцыі набываюць асаблівае значэньне. Падрыхтоўка кадраў, ліквідацыя тэхнічнай адсталасьці, камуністычнае выхаваньне мас патрабуюць, у першую чаргу, увядзеньня ўсеагульнага абавязковага навучаньня, як прадпасылкі для далейшага разьвіцьця культурнай рэвалюцыі.

Пасьпяховае ажыцьцяўленьне ўсеагульнага абавязковага навучаньня будзе, такім чынам, зьяўляцца «НАЙВЯЛІКШАЙ ПЕРАМОГАЙ НЯ ТОЛЬКІ НА КУЛЬТУРНЫМ, АЛЕ І НА ГАСПАДАРЧЫМ І ПАЛІТЫЧНЫМ ФРАНТОХ» — так ахарактарызаваў важнасьць гэтай «баявой задачы» т. Сталін у дакладзе на XVI партзьезьдзе.

Цэнтральны Камітэт партыі сваёй пастановай аб усеагульным абавязковым навучаньні абавязаў партыйныя арганізацыі па-ўдарнаму ўзяцца за кіраўніцтва правядзеньнем усеагульнага навучаньня.

Пастановы СНК СССР і БССР вызначылі цэлы рад практычных мерапрыемстваў па ажыцьцяўленьні гэтае справы.

У БССР ужо ў 1929-30 годзе ўведзена ўсеагульнае абавязковае навучаньне для дзяцей 8-гадовага ўзросту—што зьяўляецца вялікім дасягненьнем у выніку няўхільнага правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі і ўлады. У наступным годзе ў БССР абавязковым першапачатковым навучаньнем ужо будуць ахоплены дзеці 9 і 10 год. Прымаючы пад увагу блізкае сканчэньне работы па ўвядзеньні ўсеагульнага навучаньня на базе чатырохгодкі, СНК БССР ухваліў пачаць з 1930-31 году работу па ўвядзеньні ўсеагульнага абавязковага навучаньня ў другім канцэнтры сямігодкі. Таму ў 1930-31 годзе ў прамысловых цэнтрах і фабрычна-заводзкіх паселішчах дзеці ўсіх узростаў, скончыўшыя 4-годку, павінны будуць у абавязковым парадку вучыцца ў 5 групе. Пры адпаведных умовах гэтыя мерапрыемствы па абавязковым навучаньні ў 5 групе будуць праведзены і ў вясковых школах.

Вялікая работа прадстаіць і ў галіне ліквідацыі няпісьменнасьці. Вызначаны плян Наркамасьветы прадугледжвае ўсеагульную і канчатковую ліквідацыю няпісьменнасьці сярод працоўных ад 12 да 45 год на працягу 1930-31 і 31-32 г.г. Гэта азначае, што ПА СВАІХ ПАМЕРАХ І ТЭМПАХ ГЭТЫ ПЛЯН АМАЛЬ ШТО Ў ДВА РАЗЫ ПЕРАВЫШАЕ ЎСЕ ПАПЯРЭДНІЯ ПЛЯНЫ і ўсю работу за апошнія 5 год.

Здавалася, што гэтая вялізарнейшая па сваім размаху і ПАЛІТЫЧНЫМ значэньні справа ліквідацыі няпісьменнасьці і ўвядзеньня ўсеагульнага абавязковага навучаньня павінна была мабілізаваць максымум увагі з боку партыйных, прафсаюзных, камсамольскіх, савецкіх і гаспадарчых арганізацый і ўстаноў.

Што-ж мы маем на справе?

Супаноўшыся на тым, што БССР — першая увяла ўсеагульнае абавязковае навучаньне, заняла другое месца сярод іншых брацкіх рэспублік СССР у справе ліквідацыі няпісьменнасьці — шмат якія арганізацыі і нават цэнтральныя ўстановы «пачылі на лаўрах». БЯЗЬДЗЕЙНІЧАЮЦЬ.

Наркамасьветы і мясцовыя інспэктарыяты і па сёнешні дзень НЕ ПЕРАБУДАВАЛІСЯ, каб стаць сапраўднымі штабамі па кіраўніцтве ўсеагульным навучаньнем.

ПАРТЫЙНЫЯ АРГАІНІЗАЦЫІ НА МЯСЦОХ СЛАБА КІРУЮЦЬ РАЗГОРТВАНЬНЕМ ГЭТАЙ СПРАВЫ. У Гомельшчыне ні адзін партком не займаецца пытаньнем усеагульнага навучаньня. У выніку ні адзін раён не падрыхтаваны да навучальнага году. У раёнах і па сёнешні дзень нават няма вучоту дзяцей школьнага ўзросту. А такія факты НЕ АДЗІНКАВЫЯ. Яны ёсьць і ў іншых мясцох.

КАМСАМОЛ, ЯКІ ПАВІНЕН БЫЦЬ САПРАЎДНЫМ ШЭФАМ УСЕАГУЛЬНАГА НАВУЧАНЬНЯ, НЕ РАЗГАРНУЎ БАЯВОЙ РАБОТЫ.

Прафсаюзныя, гаспадарчыя, кааперацыйныя і іншыя грамадзкія арганізацыі — У БАКУ АД ВАЖНЕЙШАЙ СПРАВЫ.

Справа ўсеагульнага навучаньня НЯ СТАЛА МАСАВАЙ ПАЛІТЫЧНАЙ КАМПАНІЯЙ, у якой прымала-б удзел шырокая савецкая грамадзкасьць.

Навучальны год пачаўся, а школы, колькасьць якіх павялічылася у шмат разоў, ня маюць памяшканьняў, падручнікаў, праграм, нават сшыткаў.

Будаўнічыя арганізацыі ня выканалі пастановы СНК БССР аб першачарговасьці школьнага будаўніцтва. Райвыканкомы, гарсаветы і сельсаветы—бязьдзейнічаюць у гэтай справе.

БДВ, замест 6 тыс. праграм для гарадзкіх школ надрукавала 15 тыс., а замест 15 тыс. для вясковых школ — надрукавала ўсяго — 1.500. У выніку такой «маленькай памылачкі» па сутнасьці — ШКОДНІЦТВА — вясковыя школы засталіся без праграм, 100 настаўніцкіх канфэрэнцый, якія павінны былі працоўваць гэтыя праграмы — былі сарваны.

АДСУТНАСЬЦЬ ПАДРУЧНІКАЎ — цяжкая віна Наркамасьветы І БДВ. Але-ж замест ударнай, баявой работы па выпраўленьні сваёй памылкі — БДВ і зараз працуе марудными тэмпамі, у выніку чаго масавыя школы нават і ў бліжэйшы час ня будуць забясьпечаны неабходнымі падручнікамі.

Забесьпячэньне вясковых школ сшыткамі і тое зьнікла з поля дзеяньня нашых устаноў і арганізацый. Замест пляннага разьмеркаваньня сшыткаў, мы маем злачынную КАНКУРЭНЦЫЮ БДВ з ЦРК, зрыў разьвёрсткі, дадзенай камітэтам друку, вялікія залежы сшыткаў на складах БДВ. І гэта ў той час, калі школы павінны ўжо займацца, калі школы пашыраны і павялічаны ў шмат разоў.

БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦЬ — ЗАМЕСТ РАЗГОРТВАНЬНЯ МАСАВАЙ ПАЛІТЫЧНАЙ КАМПАНІІ, АПАРТУНІСТЫЧНАЯ НЕДААЦЭНКА «ВАЖНЕЙШАЙ ЗАДАЧЫ НА БЛІЖЭЙШЫ ПЭРЫЯД». У РАДЗЕ МЕСЦ ЗЛАЧЫННАЕ ГАЛАВАЦЯПСТВА, НЯДБАЙНАСЬЦЬ, БЮРАКРАТЫЗМ — ПАСТАВІЛІ ПАД ПАГРОЗУ ЗРЫВУ НАРМАЛЬНЫ ПАЧАТАК НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ.

Супроць апартунізму, нядбайнасьці, павінен быць накіраваны галоўны ўдар.

Патрэбны рашучыя тэрміновыя захады па ліквідацыі прарываў. Прарывы будуць ліквідаваны, калі будзе зроблена асноўнае, КАЛІ СПРАВА ЎСЕАГУЛЬНАГА НАВУЧАНЬНЯ СТАНЕ БАЯВОЙ ПАЛІТЫЧНАЙ СПРАВАЙ УСЕЙ САВЕЦКАЙ ГРАМАДЗКАСЬЦІ.

ПАРТЫЙНЫЯ І КАМСАМОЛЬСКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ павінны неадкладна абмеркаваць практычныя пытаньні па ўсеагульным навучаньні, СТАЦЬ НА ЧАЛЕ КІРАЎНІЦТВА разгортваньнем МАСАВАГА РУХУ за ўсеагульнае навучаньне.

Неадкладная перабудова работы па ўсеагульным навучаньні на апэратыўны, ударны лад, прыняцьце тэрміновых, НАДЗВЫЧАЙНЫХ мер па забесьпячэньні школ памяшканьнямі, забесьпячэньні школ падручнікамі, настаўнікамі, сшыткамі — неадкладная задача.

Прарывы на фронце ўсеагульнага навучаньня павінны быць ліквідаваны. Двухтыднёвік, які праводзіцца Наркамасьветы і камсамолам па праверцы ўсеагульнага навучаньня — павінен зрабіць рашучы пералом у выкананьні вялікага пляну ўсеагульнага навучаньня, «рашаючага кроку» культурнай рэвалюцыі.

ЛЁН ПАД УДАРАМ

Дрэнная арганізацыя рабочай сілы—пагроза ўраджаю

Трывожныя лічбы: Дрысенскі раён убраў 20 проц. пасеваў ільну; Ветрынскі—35 проц.

ГАРАДЫ, РАЁНЫ—НА ЎБОРКУ ІЛЬНУ
Арганізуем брыгады працоўнай дапамогі

Вынік бязьдзейнасьці і безадказнасьці: ні адзін ільназавод не пабудаваны.

НА ФРОНТ!

Факты з усёй выразнасьцю сьведчаць аб тым, што месцы не падрыхтаваліся да перамаганьня спэцыфічных труднасьцяй сёлетняй асеньняй пасеўнай кампаніі. Гэтыя труднасьці не зьяўляюцца нечаканасьцю. Партыя і ўрад ня раз папярэджвалі аб іх. Аднак, мясцовыя арганізацыі ня ўлічылі гэтых папярэджаньняў і ня прынялі належных крокаў, каб сустрэць асеньнюю сяўбу ва ўсеўзбраеньні.

Чым тлумачацца спэцыфічныя труднасьці ўборачнай і асеньняй пасеўнай кампаній? Асноўная прычына заключаецца ў педахваце рабочае сілы ў калгасах і саўгасах. Атрымаўшы вялізарную перамогу на фронце веснавой сяўбы, значна пашырыўшы свой яравы клін, некаторыя калгасы **не падрыхтаваліся** як сьлед да ўборкі ўраджаю, якая ва ўмовах БССР супадае з асеньняй сяўбой. Калгасы, большасьць якіх ня мае лішніх рабочых рук, прымушаны, адначасова: касіць сена, убіраць жыта, авёс, лён, бульбу, падрыхтоўваць глебу пад азімы клін і г. д. Трэба яшчэ ўлічваць дрэнпае падвор'е, якім характарызуецца сёлетні паливы пэрыяд.

Але ўсё гэта **ні ў якім разе ня можа апраўдаць** прарываў ва ўборцы ўраджаю і асеньняй сяўбы. Можна падаць шмат прыкладаў, калі калгасы, ня гледзячы на адзначаныя труднасьці, баявым тэмпам праводзілі ўборку і асеньнюю сяўбу, што зьяўляецца вынікам добрай усебаковай падрыхтоўкі.

У прыватнасьці, трэба завастрыць увагу на **найбольш слабым вучастку — на ўборцы ільну**. З ільнаводных раёнаў паведамляюць, што ўборка ільну праходзіць зусім слаба. Ход ўборкі ільну ў калгасах і саўгасах яўна незадавальняючы. Ільнаводныя калгасы адчуваюць вялікі недахват рабочае сілы для ўборкі гэтай працаёмкай культуры. Гэта паглыбляецца яшчэ тым, што ў некаторых калгасах **праца не арганізавана**, а працоўная дысцыпліна не стаіць на патрэбнай вышыні. Мясцовыя партыйныя арганізацыі не аддаюць выстарчальнай увагі гэтаму пытаньню. Нават зараз, калі пагроза ўжо навісла, месцы ня ўжываюць рашучых захадаў, каб паправіць становішча. Мы яшчэ амаль ня ведаем пра факты мабілізацыі раённых работнікаў на ўборку ільну ў калгасы. Толькі Віцебск і Полацак нядаўна мабілізавалі некалькі сот чалавек для працоўнай дапамогі маламоцным калгасам. На вачох райкому партыі гіне ўраджай ільну ў саўгасе імя 10-годзьдзя БССР. Саўгас уласнымі сіламі ўбраць ураджай ня можа. Аднак, райкой і райвыканком і слухаць ня хочуць аб тым, каб аказаць дапамогу саўгасу.

Бясспрэчна, труднасьці ва ўборцы ільну былі-б значнай ступені ліквідаваны, каб была шырока арганізавана ўзаемная дапамога паміж калгасамі і адзінаасобнікамі. Пра гэта гаворыць практыка асобных раёнаў і сельсаветаў.

На жаль, ільнаводныя раёны не ўсьвядомілі гэтай практыкі. Сярод адзінаасобнікаў не праведзена ход адпаведная масавая работа. Паміж некаторымі калгасамі і адзінаасобнікамі ўсё яшчэ існуюць няправільныя, а часам і абвостраныя ўзаемаадносіны. Раённыя арганізацыі не змагаюцца рашуча і сыстэматычна за ліквідацыю такога становішча.

Гаворачы пра лён, нельга прайсьці міма тых абураючых зьявішч, якія ёсьць у ільнаводных саўгасах ільнапаньковага аб'яднаньня (Боркавічы, Адаменкі і г. д.). Ільнаабʼяднаньне ня здолела наладзіць кіраўніцтва гэтымі саўгасамі. Адміністрацыя саўгасаў таксама яўна не спраўляецца са сваімі абавязкамі. І ў выніку мы маем злачынна марудныя тэмпы ўборкі ільну.

Да рэчы, беларускае ільнапаньковае аб'яднаньне, на якое ўскладзены такія важнейшыя задачы, як выявілася зьяўляецца... спэцыяльнай арганізацыяй, якая ня мае... гаспадара. Ні Наркамзем, ні ВСНГ ня хочуць прыняць ільнаабʼяднаньня. Зараз, між іншым, ільнаабʼяднаньне знаходзіцца ў калідорах ВСНГ. Трэба неадкладна ліквідаваць гэту агіднасьць і спыніць бюракратычныя спрэчкі паміж ВСНГ і НКЗ. Адначасова з усёй відавочнасьцю пасьпела пытаньне аб рашучым узмацненьні работы ільнаабʼяднаньня. Трэба ўзмацніць кіраўніцтва абʼяднаньнем, якое зараз са сваімі задачамі не спраўляецца.

Рэзюмуем: **становішча з уборкай ільну выключна трывожнае.** Патрэбны самыя рашучыя і тэрміновыя меры, баявыя, надзвычайныя мерапрыемствы.

Трэба зараз-жа зрабіць адпаведную перастаноўку сіл у калгасах, правільна арганізаваць працу, рацыянальна скарыстаць наяўныя рэсурсы рабочай сілы.

Раёны і гарады павінны кінуць брыгады на дапамогу маламоцным калгасам. Трэба пашырыць вопыт Віцебску і Полацку, якія мабілізавалі сотні людзей па ўборку ільну.

Важнейшая і актуальнейшая задача — мабілізаваць адзінаасобніка на ўзаемную дапамогу калгасьнікам. Гэта справа — баявая задача мясцовых партыйных арганізацый. Шырэй разгорнем масавую агітацыйную работу сярод бядняцка-серадняцкіх мас адзінаасобнікаў.

Лён да апошняга гэктара павінен быць убраны.

У. Л—н.

Толькі-б адчапіцца

Саўгас імя 10-годзьдзя БССР ўбраць лён уласнымі сіламі ня можа.

Кіраўніцтва саўгасу, у сувязі з гэтым, зьвярнулася ў Бабруйскі райком партыі і райвыканком з просьбай дапамагчы ва ўборцы ільну. Бабруйскі РК тэлеграфна адказаў, што арганізаваць брыгады на дапамогу ён ня можа і рэкамандуе саўгасу папрасіць дапамогі ў сельскіх вучняў. Відаць райкому партыі проста хацелася адчапіцца. А тое, што ўраджай ільну ў саўгасе стаіць пад пагрозай, работнікаў райкому напэўна ня турбуе.

Ар.

ПЛЯНЫ, КАМІСІІ, ПРАЕКТЫ—
А КАРЫСЬЦЬ...

Боркавіцкі ільназавод ужо павінен быць гатовы, але і сёньня на месцы пабудовы няма нічога

БОРКАВІЧЫ. (Брыгада «Зьвязды»). Паводле пастановы СНК БССР на Полаччыне арганізаваны буйны ільнаводны саўгас Боркавічы. Плошча саўгасу 7.500 га. У далейшым саўгас пашырыцца да 20.000 гектараў.

Як-жа праходзіць арганізацыя гэтае гаспадаркі? Сапраўднае становішча саўгасу выклікала сур'ёзную трывогу. У Боркавічах ёсьць на сёньняшні дзень 83 пастаянныя рабочыя, з іх 28 трактарыстых, 15 трактараў з усім прычаннымі машынамі, 14 ільнацерабільных машын і г. д. Адна ільнацерабільная машына, між іншым, у часе ўборкі ільну замяняе мінімум 40 работніц. Увесну на лясным масыве, дзе знаходзіцца тэрыторыя саўгасу, працавала 700 рабочых. 1.900 га лясной плошчы былі раскарчаваны. На будучы год трэба будзе раскарчаваць мінімум 3.200 га і засеяць 3.500 гэктараў ільну.

Гэта вялікае і складанае заданьне патрабуе правядзеньня папярэдніх падрыхтоўчых работ. Аднак, цяперашні ход работ у саўгасе ні ў якім разе не забясьпечвае выкананьня заданьня.

Уборка ільну на плошчы да 500 гэктараў у саўгасе пачалася 15 жніўня. Рабочых рук не хапае. Саўгас забясьпечаны рабочай сілай самае большае на 30 проц. З-за адсутнасьці рабочых у саўгасе лён на 50 проц. ня поляты. Пасевы ільну зарасьлі сарнякамі, што стварыла вялікія труднасьці ва ўборцы.

Агідна пастаўлена арганізацыя працы. Працоўная дысцыпліна ў саўгасе нікуды ня варта. Нядаўна 4 трактарыстыя прагулялі па 10-15 дзён, а адміністрацыя саўгасу сваячасова ня ведала аб гэтым факце. Адзін з прадстаўнікоў адміністрацыі нават рашуча выступіў у абарону прагульшчыкаў. У саўгасе ёсьць партыйная і камсамольская ячэйкі, але ні партыйцы, ні камсамольцы ня ідуць наперадзе. Як партыйная, так і камсамольская ячэйкі не рэагуюць на агідныя непарадкі, якія ёсьць у саўгасе.

Урад БССР пастанавіў пабудаваць у Боркавічах ільназавод. Гэты завод павінен быць адным з асноўных буйнейшых ільназаводаў рэспублікі. Яшчэ з красавіку СНК залрапанаваў неадкладна прыступіць да пабудовы заводу і максымальна фарсаваць тэмпы будаўніцтва. Але... месяцы ідуць, а будаўніцтва зусім не разгорнута. Складаюцца каштарысы, чарцяжы, пляны. Ідуць гарачыя ведамсьцвеныя спрэчкі з мясцовымі арганізацыямі за зямельныя вучасткі, але пабудова паранейшаму стаіць на мёртвым пункце. На месцы будаўніцтва на сёньняшні дзень няма ні адной цаглінкі, ні адной трэскі. Будаўнічы сэзон хутка скончыцца, аднак падкрэсьліваем, у саўгасе да гэтага часу ніхто не прыступае да будаўніцтва ільназаводу.

Толькі зусім нядаўна былі атрыманы праекты будаўніцтва. Ёсьць праекты, але няма чарцяжоў і каштарысаў. Іх складалі, аднак ніяк ня могуць скласьці. З Менску і з Масквы ў саўгас прыяжджалі дзесяткі розных камісій. Камісіі рабілі абсьледаваньні, вынадзі, выпрацоўвалі прапановы і заўвагі, а якая карысьць? Ніякай.

Ваколічным ільнаводным калгасам і адзінаасобнікам раённыя арганізацыі абяцалі прымаць лён для апрацоўкі на боркавіцкі завод. А зараз выяўляецца, што да пабудовы заводу, як мы ўжо адзначылі, нават ня прыступлена.

Гэта яшчэ ня ўсё. Аказваецца, што да сёньняшняга дня няма плану арганізацыі боркавіцкага ільнаводнага саўгасу. Аказваецца да гэтага часу няма гарачыя спрэчкі, дзе будзе цэнтр саўгасу. Зноў у саўгас прыяжджалі дзесяткі камісій, якія спрачаліся наконт цэнтру і зноў ніякай карысьці.

* * *

Будаўніцтва боркавіцкага ільнасаўгасу і ільназаводу знаходзіцца ў вялізарнейшай небясьпецы. Трэба суровае пакараць тых, хто правініў пабудову заводу, трэба аддаць пад суд тых, хто тармозіць і зрывае арганізацыю саўгасу. Слова за **прокуратурай.**

ЖУКАЎ.

Супроць зьверскай расправы фашысцкіх банд над Максам Гельцам

Абурэньне рабочых Ленінграду

ЛЕНІНГРАД, 11. Паведамленьне аб зьверскай расправе фашысцкіх банд над правадыром германскага пралетарыяту Максам Гельцам выклікала абурэньне сярод працоўных мас Ленінграду. На фабрыках і заводах адбыліся мітынгі пратэсту супроць агіднага нападу на Макса Гельца. «Усё больш і глыбей,—гаворыцца ў рэзалюцыі рабочых «Красного Путиловца», — абвастраецца палітычны і эканамічны крызіс ва ўсім капіталістычным сьвеце, вастрэй становіцца клясавая барацьба. Напад фашыстых на Макса Гельца зьяўляецца яскравым фактам азьвярэньня буржуазіі. Фашысцкая паліцыя прыняла зьвяньне Макса Гельца — аднаго з правадыроў рабочае клясы, як належнае. У адказ на гэта рабочыя «Красного Путиловца», «Красного Треугольника» і заводу імя Макса Гельца кідаюць клічы: «Яшчэ мацней згуртаваць рады рабочых вакол УсеКП(б), яшчэ больш паны рыць міжнародную салідарнасьць рабочых. На вылазку фашысты краснацуцілаўцы адкажуць яшчэ большым узмацненьнем абароназдольнасьці краіны і барацьбою за ліквідацыю прарываў прамфінпляну».

Абурэньне рабочых мас Саксоніі

БЕРЛІН, 11. Нахабны напад фашысых на т. Макса Гельца выклікаў не ўсёй Саксоніі вялізарнае абурэньне сярод рабочых. Не зважаючы на цяжкія параненьні, Макс Гельц зноў адпраўіўся ў агітацыйную паездку і сёньня выступае ў Плаўэне.

Пад знакам румынскіх выбараў у Польшчы

Апошнія тэлеграмы з Варшавы гавораць аб пастаянных масавых арыштах камуністых, рэвалюцыйных рабочых і сялян, а таксама сэнсацыйным «нечаканым» арышце 18 правадыроў «апазыцыйных» партый, якія склалі выбарны блёк пад гучнай назвай «Саюзу абароны іграў і свабоды народу».

У той час, як першая катэгорыя арыштаў зьяўляецца зусім звычайным і нармальным зьявішчам для рэвалюцыйнага руху ў Польшчы ня толькі пры фашысцкім, але і пры ранейшым парляманцкім рэжыме, арышты панаў Барліцкіх, Лібэрманаў, Багінскіх і іншых адбываюцца першы раз у гісторыі Польскай рэспублікі. Сэнсацыйны бок справы заключаецца ў тым, што дзеячы «апазыцыйнага» крыла польскага фашызму арыштаваны ня гледзячы на свае «гістарычныя» заслугі ў барацьбе з рэвалюцыйным рухам і па сваю ролю выратавальнікаў капіталістычнага ладу ў цяперашні пэрыяд крызісу. Ужо ў 1920 годзе цяперашнія правадыры «цэнтра-левай» Дашынскі і Вітас, знаходзячыся на чале ўраду капіталістых і памешчыкаў, пры дапамозе турмаў, праванацый і ашуканства працоўных мас выратоўвалі польскую буржуазію ад рэвалюцыі. Яны разам з маршалам Пілсудскім былі тады арганізатарамі ваеннага нападу на краіну саветаў, адбітага контр-наступленьнем Чырвонай арміі. Яны яшчэ нядаўна выхвалялі свае гераічныя ўчынкі, успамінаючы аб славутым «цудзе над Віслай». Потым паны Барліцкія, Лібэрманы, Багінскія стараліся зноў верай і праўдай служыць Пілсудскаму, які арабіў майскі пераварот, усё-ж 18 правадыроў «цэнтра-левай» па загаду Пілсудскага пасаджаны ў турму. Ці на доўга — гэта іншая справа. Але факт застаецца фактам. Ён кідае яркае сьвятло на абвастрэньне крызісу ў Польшчы і ўзмацненьне працэсу развалу ў фашысцкім лягеры. Ён паказвае, што спрэчкі паміж асобнымі фракцыямі гэтага лягеру аб метадах выратаваньня капіталістычнай стабілізацыі прыймалі надзвычайна востры характар.

Стараючыся забясьпечыць за ўрадавым блёкам у будучым сойме цьвёрдую большасьць, Пілсудскі пастанавіў напалохаць апазыцыю, арыштаваць частку яе правадыроў. Ён спадзяецца такім чынам умацаваць урадавы блёк за кошт «цэнтра-левай», з якой ужо выйшлі хрысьціянскія дэмакраты. Ён разьлічвае таксама на ўход з «цэнтра-левай» часткі «сялянскіх» груповак. Нарэшце, і гэта самае важнае з пункту погляду выбарных камбінацый, — Пілсудзкі хоча правесьці бескантрольныя выбары, на што ён ужо намякнуў у сваім апошнім інтэрв'ю. Ён хоча перашчагаляць румынскія выбары.

Арышты сярод правадыроў «цэнтра-левай», якія адлюстроўваюць разброд у фашысцкім лягеры, маюць таксама і іншы бок. Гэтыя арышты могуць пасеяць новыя ілюзіі сярод менш сьвядомых пластоў працоўных аб барацьбе, якая нібыта адбываецца паміж двума лягерамі — лягерам фашызму і лягерам «дэмакратыі». Гэтыя арышты могуць зьбіць з толку таксама частку мас, што ідуць за камуністымі. Вось як ацэньвае ролю сацыял-фашызму адзін з бальшэвэрскіх публіцыстых — Олтаржэўскі ў лодзінскім лейб-органе Пілсудзкага «Рэспубліка»:

«З 1918 па 1926 год роля сацыялізму ў Польшчы ўсё больш падала. «Роботнік» быў тады амаль афіцыйным органам таго ці іншага міністэрства. Сярод мас усё больш пашыраўся камунізм. Сацыялістыя пераходзілі з аднае пазыцыі на другую. Яны ня мелі з кім «змагацца», бо яны самі панавалі. І вось наступіла адраджэньне ППС. З якім здавальненьнем мы чытаем гэтыя задорныя перадавіцы «Роботніка». Калі ў 1926 годзе, пасьля майскага перавароту зьявілася ў маршала Пілсудскага дэлегацыя ад ППС усклаўшы некалькіх соймавых дэпутатаў, маршал ня прыняў яе, сказаўшы адʼютанту: «Няхай гэтыя паны ня швэндаюцца па маіх калідорах. Іх месца на фабрыках і на вуліцы. Няхай там робяць сваю справу...»

У гэтых адносінах кампартыя Польшчы, супроць якой накіраваны ўсе ўдары фашысцкага тэрору, павінна быць на варце. Асьперагаючыся як нераацэнкі, так і недааценкі ўнутраных спрэчак у фашысцкім лягеры, яна павінна цярпліва і настойліва растлумачваць масам сапраўдны сэнс барацьбы паміж асобнымі фракцыямі гэтага лягеру. Яна павінна сыстэматычна выкрываць перад масамі сацыял-фашыстых і народнікаў — фашысцкіх правадыроў. Пры дапамозе ўмела праведзенай тактыкі адзінага фронту зьніву, кампартыя Польшчы павінна адрываць ад іх і ўцягваць масы ў рэвалюцыйнае змаганьне супроць фашысцкай дыктатуры.

(«ПРАВДА»).

ПЕРАЗАКЛЮЧЭНЬНЕ КАЛЕКТЫЎНЫХ ДАГАВАРОЎ СКОНЧЫЦЬ ДА 15 КАСТРЫЧНІКА 1930 Г.

Пастанова прэзыдыуму УсеЦСПС ад 11-га верасьня

Выходзячы з неабходнасьці ўвязаць надыходзячае перазаключэньне калектыўных дагавароў з кампаніяй за поўнае выкананьне вытворчай праграмы бягучага году і за забесьпячэньне пляну 30-31 году, якая адбываецца на прадпрыемствах, у сувязі з адозвай ЦК УсеКП(б) і пастановай прэзыдыуму УсеЦСПС ад 3 верасьня, прэзыдыум УсеЦСПС пастанаўляе:

1. Неадкладна пачаць калдагаворную кампанію і абавязаць усе прафарганізацыі разьвіць яе, як шырокую масавую гаспадарча-палітычную кампанію з тым, каб у асноўным ПЕРАЗАКЛЮЧЭНЬНЕ КАЛЕКТЫЎНЫХ ДАГАВАРОЎ СКОНЧЫЦЬ ДА 15-ГА КАСТРЫЧНІКА 1930 ГОДУ, А ЎСЮ КАЛДАГАВОРНУЮ КАМПАНІЮ— да 1-ГА ЛІСТАПАДА 1930 ГОДУ. Устанавіць пачатак дзеяньня новых калектыўных дагавароў — 1 кастрычніка 30 году з тым, каб тэрмін іх дзеяньня супадаў з гаспадарчым годам.

2. Пачаць калдагаворную кампанію шырокай масавай праверкай выкананьня калектыўных дагавароў, якія дзейнічаюць. З гэтае мэты на кожным прадпрыемстве арганізаваць дзесяціднёўку праверкі выкананьня калектыўных дагавароў. На працягу «дзесяціднёўкі» праверыць фактычнае выкананьне ўзятых на сябе абавязацельстваў як з боку прафсаюзаў і рабочых, так і з боку гаспадарчых арганізацый, выкананьня прамфінпляну па колькасных і якасных паказальніках (выпуск прадукцыі, зьнижэньне сабекошту, паляпшэньне якасьці, рост прадукцыйнасьці працы і зарплаты, абавязацельствы па ахове працы, спэцвопратцы і па паляпшэньні культурна-бытавых, жыльлёвых умоў і г. д.).

3. Для правядзеньня праверкі на ўсіх прадпрыемствах фабрычна-заводзкія камітэты павінны неадкладна стварыць заводзкія і цэхавыя ВКК і ў дапамогу ім арганізаваць з лепшых ударнікаў брыгады па праверцы выкананьня калектыўных дагавароў У цэху можа быць створаны рад брыгад па праверцы выкананьня пасобных частак калектыўнага дагавору. Усе вынікі праверкі павінны быць даведзены да шырокіх мас рабочых. Разам з гэтым саюзныя арганізацыі павінны прыняць рашучыя меры да правядзеньня ў жыцьцё ўсіх нявыкананых абавязацельстваў калектыўнага дагавору як з боку адміністрацыі, так і з боку рабочых.

4. Ускласьці на ФЗМК, ЧКК і брыгады па праверцы падрыхтоўкі збор матар'ялаў і прапаноў да новага калектыўнага дагавору. Выходзячы з гэтага пічыць неабходным разгарнуць шырокі масавы збор прапаноў рабочых да новага калектыўнага дагавору, з улікам інтарэсаў далейшага разгортваньня вытворчасьці, патрэбнасьцяй рабочых. Абавязаць ЦК саюзаў, абласныя, заводзкія і раённыя аддзелы неадкладна прыступіць да зьбіраньня і адначасова з прадпрыемствамі прапрацоўкі матар'ялаў да новага калектыўнага дагавору, не чакаючы скончэньня прапрацоўкі матар'ялаў на прадпрыемствах і дырэктыў зьверху.

5. Прэзыдыум УсеЦСПС абавязвае ўсе ЦК саюзаў і мясцовыя аддзелы саюзаў, а таксама ўсе абласныя і мясцовыя саўпрофы неадкладна мабілізаваць адказных работнікаў для правядзеньня калдагаворнай кампаніі, пакінуўшы ў апаратах мінімальную колькасьць работнікаў. Мабілізаваныя работнікі павінны быць кінуты непасрэдна на прадпрыемствы для жывой арганічнай работы, кіраўніцтва і дапамогі ФЗМК і рабочым брыгадам па праверцы выкананьня калектыўнага дагавору і падрыхтоўкі перазаключэньня новага калектыўнага дагавору.

6. Абавязаць ЦК саюзаў, абласныя і мясцовыя аддзелы ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ПРАДПРЫЕМСТВЫ ПРАЕКТАМІ НОВАГА КАЛЕКТЫЎНАГА ДАГАВОРУ ЦІ ІХ АСНОЎНЫМІ ЗЬМЕНАМІ НЕ ПАЗЬНЕЙ 25-ГА ВЕРАСЬНЯ. Саюзпрофы павінны прасачыць за выкананьнем гэтай дырэктывы, неадкладна паведамляючы УсеЦСПС аб выпадках невыкананьня. Прапрацоўка калектыўнага дагавору саюзамі і абмеркаваньне яго гаспадарчымі арганізацыямі павінна быць распачата зараз-жа пасьля абмеркаваньня праекту дагавору на рабочых сходах, але НЕ ПАЗЬНЕЙ 1-ГА КАСТРЫЧНІКА.

7. У апошніх чыслах верасьня на ўсіх прадпрыемствах павінны быць арганізаваны спачатку цэхавыя сходы, затым агульна-заводзкія канфэрэнцыі з парадкам дня: а) вынікі выкананьня прамфінпляну 29-30 году і кантрольныя лічбы 3-га году пяцігодкі. Даклад заводакіраўніцтва і содаклад ФЗМК ці часовай кантрольнай камісіі аб сустрэчным прамфінпляне, аб выніках праверкі выкананьня калектыўнага дагавору і праект новага калектыўнага дагавору. Да клад ФЗМК і заводакіраўніцтва.

8. Апублікаваць у друку сумесны дырэктыўны ліст УсеЦСПС і ВСНГ аб перазаключэньні калдагавароў на 30-31 год не пазьней 17 верасьня. Абавязаць ЦК саюзаў падпісаць з адпаведнымі Ўсесаюзнымі гаспадарчымі аб'яднаньнямі і апублікаваць у друку асноўныя дырэктывы мясцовым арганізацыям па перазаключэньні калдагавароў не пазьней 20 верасьня.

9. Абавязаць усе абласныя, гарадзкія і раённыя саветы прафсаюзаў неадкладна сілікаць актывы фабрычна-заводзкіх камітэтаў і брыгад па праверцы і растлумачэньні задач калдагаворных кампаній ў сувязі з трэцім годам пяцігодкі. Абавязаць усесаюзныя арганізацыі забясьпечыць шырокае абслугоўваньне калдагаворнай кампаніі з боку ўсяе сеткі клюбных устаноў, чырвоных кутнюў і г. д.

**10. Абавязаць усе ЦК саюзаў і абласныя саветы прафсаюзаў дасылаць ва УсеЦСПС пяціднёўныя зводкі аб ходзе калдагаворнай кампаніі на важнейшых прадпрыемствах. Прэзыдыум УсеЦСПС зьвяртае ўвагу ўсіх прафсаюзных арганізацый на тое, што надыходзячае перазаключэньне калдагавароў зьяўляецца адным з важнейшых умоў пасьпяховага выкананьня пяцігодкі за 4 гады і далейшага паляпшэньня становішча шырокіх рабочых м

ДА ЛІКВІДАЦЫІ АКРУГ

НЯ У БЫЛЫЯ ПАВЯТОВЫЯ ЦЭНТРЫ

НАКІРОЎВАЦЬ БОЛЬШАСЬЦЬ АКРУГОВЫХ РАБОТНІКАЎ

У першую чаргу узмацніць работнікамі далёкія сельска-гаспадарчыя раёны

Хто яшчэ не перабудаваўся

Якое ў нас на Беларусі становішча з ліквідацыяй акруг і ўзмацненьнем раёнаў? Член ЦКК УсеКП(б) т. **Штраух**, які знаходзіцца зараз у Менску, і вывучае ход работы, распаўвае гэта становішча так — **«нельга сказаць, што гэта справа прасоўваецца на Беларусі вельмі дрэнна, параўнаўча добра работа ідзе па лініі партыйна-савецкай, ня дрэнна ідзе спуск у раёны акруговых «дваццатак»—значна горш справа ў адносінах гаспадарчых арганізацый».**

Дзе ў нас зараз слабыя месцы з узмацненьнем раёнаў?

Матар'ялы нарады пры ЦКК-РСІ даюць нам некаторы адказ на гэтыя пытаньні.

Ствараюць сурагаты паветаў

Гаспадарчыя арганізацыі Беларусі яшчэ пасапраўднаму не зьвязаліся з раёнамі і не арганізавалі там сваіх ячэек. Заўважаецца тэндэнцыя да пакіданьня сваіх ранейшых акруговых кантор і філіялаў пад выглядам упоўнаважаных. Беларуская кантора Саюзхлеба клучае разам некалькі раёнаў, утвараючы нешта накшталт «паветаў». Так, Саюзхлеб да Слуцкага раёну — буйнога хлебнага раёну — чамусьці яшчэ прычапіў Гроскі і Копыскі раёны.

„У стадыі ўзгадненьня"

Пераманьванне акруговых работнікаў з боку цэнтральных савецкіх і гаспадарчых арганізацый яшчэ ня спынілася. На нарадзе пры ЦКК-РСІ мы чулі такую думку кіраўніка гаспадарчай установы — **«лепш адказваць за няправільнае прыняцьце работніка, чым за няправільную работу».**

Прафсаюзы і месцкомы не рэагуюць на ганебныя факты пераманьвання.

Наркамправы ўсё яшчэ зьбіраецца выдаць пастанову адносна пераманьвання, адносна дэзэртырства работнікаў. Але гэты праект пастановы ўсё яшчэ ня выйшаў з стадыі ўзгадненьня.

Блукаюць у цемры

Балючае месца — гэта поўная адсутнасьць у нас эканамічнага аналізу ў раённым разрэзе. Гаспадарчыя арганізацыі зварачаюцца ў ЦСУ за эканамічнымі матар'ялмі і там іх не знаходзяць. А тыя вымногія матар'ялы, якія ёсьць, адносяцца да перапісу 1926 году. І ў выніку цэнтральныя установы і гаспадарчыя арганізацыі блукаюць у цемры і ня ведаюць, як ім скласьці раённыя пляны — яны выходзяць або перапалічанымі, або зьменшанымі.

Некаторыя эканамічныя матар'ялы знаходзіліся ў акругах. І вось выяўляецца, што зараз з ліквідацыяй акруговых цэнтраў гэтыя сабраныя каштоўныя эканамічныя матар'ялы тута зьвязаюцца вяроўкай і зехоўваюцца ў пыльных архівах.

У павуціньні „транспартнага" бюракратызму

Наша прамысловасьць і наш транспарт яшчэ не прыстасаваліся да абслугоўваньня раёнаў. Гэта мы бачым на прыкладзе адпраўленьня тавараў для раёнаў. Раней тавары ў акруговыя цэнтры накіроўваліся цэлымі вагонамі. А зараз раёны, якім не пад сілу атрыманьне тавараў цэлымі вагонамі, просяць цакласьці ў адным вагоне пасобныя партыі тавараў, якія яны будуць зьбіраць па шляху сьледаваньня вагону. Але гэтыя просьбы раёнаў застаюцца без здавальненьня — бачыце, чыгуначны тарыф так пабудаваны, што адпраўка тавараў навагонна каштуе значна таней. Тады трэба зьмяніць тарыф, прыстасаваўшы яго да патрабаваньняў раёнаў.

Нетры „сумненьняў"

Ашчадныя касы, праз якія мы праводзім мабілізацыю ўнутраных рэсурсаў, папішны усімі сіламі прасоўваюцца ў раён. Але на справе мы бачым адваротнае зьявішча. У 50 раёнах ашчадныя касы яшчэ не арганізаваны. Шмат якія РВК (напрыклад, Расьвянскі, Хойніцкі) нават адмаўляюцца ад прадастаўленьня памяшканьняў для ашчадных кас, лічачы арганізацыю раённых ашчадных кас «нямэтазгоднай». Плешчаніцкі райком станіць пытаньне — а можа ашчадкаса ў нас і зусім непатрэбна?

Патрэбны сталоўкі

Работнікаў, якія прыяжджаюць у раён, трэба перш за ўсё пакарміць. Для гэтага патрэбны раённыя сталоўкі, раённыя пункты грамадзкага харчаваньня. А Белкаапсаюз ня прыкладае вялікіх намаганьняў да арганізацыі раённай сеткі сталовых — там нават добра ня ведаюць, колькі раённых пунктаў грамадзкага харчаваньня ў іх ёсьць і як яны працуюць.

Прадстаўнік Белкаапсаюзу на нарадзе пры ЦКК-РСІ заявіў — цяжка нам арганізаваць сталовыя ў раёнах, няма абсталяваньня, няма калярових мэталяў. Але дазвольце, таварышы з Белкаапсаюзу — якія тут патрэбны катлы і каляровыя мэталі, гутарка ідзе не пра нейкія фабрыкі-кухні, а пра самыя звычайныя элемэнтарныя сталовыя, дзе прыяжджыя работнікі маглі-б паабедаць і выпіць гарбаты.

Апрача таго, трэба яшчэ падумаць аб якіх-небудзь заезджых дамох, гасьцінцах, дзе работнікі маглі-б запачываць, аб цырульнях і лазьнях. Аб гэтым павінны паклапаціцца каапэрацыя і райвыканкомы і гаспадарчыя арганізацыі. Мы павінны ўсё зрабіць для таго, каб добра абслужыць работнікаў у раённых цэнтрах, стварыўшы для іх добрыя ўмовы для работы.

Л. НЯФЕДАЎ.

Зьніклі няма вядома куды

Згодна пастановы аршанскай ліквідацыйнай камісіі, у Крупскі раён павінны паехаць на сталую работу наступныя работнікі: т.т. ЛАЎРЫНАЎ, БУРАКОЎ, БРЫГІС.

Дэ гэтага часу гэтыя таварышы не прыступілі да работы ў раёне. Тав. БУРАКОЎ прыехаў, паказаўся ў мястэчку, пабыў тыдзень і ЗЬНІК.

Амаль, што ўсе іншыя адказныя работнікі райкому знаходзяцца ў адпачынку.

Неабходна зараз-жа ўжыць захады, каб зьнішчыць гэта пагражаючае становішча.

РАЙПРАЦАЎНІК.

Весткі аб ходзе ліквідацыі акруг, якія прыбываюць у рэдакцыю „Зьвязды", гавораць пра ненармальнасьці, якія дапускаюцца ў некаторых мясцох. Як відаць са зьмешчанага ніжэй матар'ялу, значная частка акруговых работнікаў накіроўваецца ў раёны больш блізкія да акруговага цэнтру і чыгункі. Пры такім становішчы больш далёкія ад цэнтру і чыгункі раёны застануцца неўмацаванымі.

Такое становішча недапушчальна.

Рэдакцыя „Зьвязда" ставіць пытаньне перад усімі адпаведнымі органамі аб прыняцьці неадкладных мер для выпраўленьня дапушчаных памылак.

„Блізкія" і „далёкія" у Магілеўшчыне

Ёсьць у Магілеўшчыне блізкія да гораду раёны і раёны, якія знаходзяцца ля чыгуначнай станцыі. Гэта напр. Магілеўскі, Быхаўскі, Шклоўскі, Клімавіцкі і інш. Але ёсьць на Магілеўшчыне і далёкія, глухія раёны, аддаленыя на 40-50 клм. ад чыгуначнай станцыі: Хоцімск, Чачэвічы, Краснапольле, Карма і Журавічы.

У часе разьмеркаваньня «дваццатак» амаль што ўсе з гэтай групы таварышоў былі накіраваны ў «раёны першай катэгорыі», у «лепшыя», блізкія да гарадоў і чыгункі.

Шмат іншых былых акруговых працаўнікоў стараялася, каб калі ўжо і паехаць у раён, дык толькі ў гэтыя «лепшыя» раёны. Шмат застаецца ў горадзе. Ёсьць такія, якія пад выглядам паездкі на вучобу засталіся ў горадзе, як, напрыклад, — т. Вайнман (б. старшыня АПБ), т. Ляшчынскі (б. адказны сакратар АПБ).

С.

Пераглядзець

КАЛЯ 7 ТАВАРЫШОЎ З КІРАЎНІЧАЙ «ДВАЦЦАТКІ» БАБРУЙСКАЙ АКРУГІ НАКІРОЎВАЮЦЦА НА РАБОТУ Ў СЛУЦАК; МІЖ ІХ—Т.Т.: ЦАХІЛЬНІЦКІ, БАГДАНАЎ, ПАКРОЎСКІ І ІНШ.

ЗУСІМ ЗРАЗУМЕЛА, ШТО ТАКОЕ СТАНОВІШЧА НЕНАРМАЛЬНАЕ, ШТО ЯНО СУПЯРЭЧЫЦЬ ДЫРЭКТЫВАМ ПАРТЫІ АБ УЗМАЦНЕНЬНІ БОЛЬШАЙ КОЛЬКАСЬЦІ С.-Г. РАЁНАЎ.

РАЗЬМЕРКАВАНЬНЕ КІРАЎНІЧЫХ РАБОТНІКАЎ ПА БАБРУЙСКАЙ АКРУЗЕ ПАВІННА БЫЦЬ ПЕРАГЛЁДЖАНА.

П. Л.

Пад шыльдай „рэзэрву"

Наперакор усім дырэктывам партыі і ўраду, група партыйцаў, адказных работнікаў у Магілеве застаецца ў горадзе. Замест таго, каб пасласць іх неадкладна ў раёны, ліквідком праўляе маруднасьць, а гэтыя работнікі да гэтага часу застаюцца нібы ў «рэзэрве».

Каган — адказны сакратар Магілеўскага АВК. 10 год працуе ў акруговых установах. Яго прызначалі ў 4 месцы і нікуды ён не паехаў. Прызначалі старшынём Лупалаўскага РВК, сакратаром Магілеўскага РВК, сакратаром гарсавету, старшынём Чапускага РВК і, паводле апошняй пастановы, **застаўся ў рэзэрве.**

Раскін — дырэктар дзяржбанку. Спачатку **АК КП(б)Б** адпусьціў яго ў Казань, **але** гэта забараніў ЦК КП(б)Б. Выпрашылася пытаньне аб пасылцы яго за гадыкам фінчасткі Краснапольскага РВК, але ў зьвязку з тым, што гэта раён далёкі ад чыгункі, пытаньне аб Раскіне засталося адкрытым — ён **застаўся ў рэзэрве.**

Кацман — загадчык аддзелу кадраў АК яшчэ да гэтага часу знаходзіцца **ў рэзэрве.**

Яшчэ шмат чаго могуць сказаць пратаколы бюро АК КП(б)Б, пра тое, як зацягваецца пасылка адказных работнікаў.

«СКІТАЛЕЦ».

Неабходна грамадзкае ўзьдзейнічаньне

У ліку былых акруговых работнікаў г. Віцебску, ёсьць частка, якая ставіць свае асабістыя запатрабаваньні вышэй задач, ускладзеных на іх партыяй і савецкай уладай.

Да ліку апошніх можна дадаць былых працаўнікоў Віцебскага акрвыканкому Гладкова, Ісагава, якія былі пасланы ў Высачанскі і Бешанковіцкі раёны, але дэзэртыравалі.

Спецыялісты Лаўрыкевіч знайшоў больш для сябе прыемным працаваць у сабры праўленьня Саюзхлеба ў г. Віцебску, чым адпраўцца на працу ў Высачанскі раён. Былы загадчык экпраўаддзелам акрвыканкому Ігудэсман знайшоў сабе цёпленькае месьцейка ў Віцебскім гарсавеце. За гэтымі ідзе цэлая галерэя іншых спецыялістых, як напр., агранам Пятроў, статысты Вэрлінг, Хаклоў, Булашэвіч, памвод Ліпшік, тэхнік Клібанаў, галоўбух Буйніцкі, бухгальтар Зарецкі і інш., якія запісаліся на працу ў горадзе Віцебску, адмовіўшыся ад паездкі ў раён.

Кіраўнікі Віцебскага гарсавету і адпаведных установаў пазаконна затрымліваюць у горадзе былых акруговых працаўнікоў, якія павінны былі выехаць на вёску.

Інспэктар працы Заэдрыс, на якога ускладзены нагляд за адъездам працаўнікоў у раёны, праяўляе поўную бязьдзейнасьць, а гэтым ён садзейнічае дэзэртырству.

Мы патрабуем умяшальнасьці гарадской КК з тым, каб партыйцы, вінаватыя ў зрыве дырэктывы партыі аб пасылцы працаўнікоў а вёску, былі прыцягнуты да суровай партыйнай адказнасьці, каб у адносінах да ўсіх астатніх былі прынятыя належныя меры па лініі прафесіянальных арганізацый і РСІ.

САБЕЦКІ.
КАГАН.

Бальшавіцкую адозву па-бальшавіцку рэалізаваць

З новым імпэтам—у змаганьне за прамфінплян

У мінулых нумарох «Зьвязды» мы падавалі весткі аб тым, што рабочыя менскай абутковай фабрыкі адпачылі дзень 7-га верасьня некаторым перавышэньнем сутачнае нормы выпрацоўкі гатовае прадукцыі.

Але 5 верасьня паказала зноў невыстарчальныя тэмпы ліквідацыі прарыву. У выніку — замест 3.450 пар абутку — выпрацавана толькі 3.003. Недахват — 347 пар.

І 7-га верасьня на адкрытым партыйна-камсамольскім сходзе пытаньне, як запоўніць прарыў у выкананьні прамфінпляну другога году пяцігодкі, заняла галоўную увагу.

Сход пачаўся ўвечары і скончыўся толькі **а палове чацьвертай уначы.** Даўно ня бачылі муры фабрыкі такога гарачага, уздымнага і, разам з тым, дзелавога і ўпартага сходу. На ім выступалі і старыя рабочыя са стажам, рабочыя, што на ўласным карку вынесьлі ў галодныя і халодныя гады ўвесь цяжар адбудаваньня сацыялістычнага прадпрыемства.

Яны гаварылі — і шмат гаварылі! — аб прычынах прарыву. Яны ганьбілі «лятуноў», ганьбілі тых рабочых, якія сьвядома брудзяць фабрыку сьмецьцем браку.

Дырэктар фабрыкі тав. Плаўнік тутжа на сходзе паведаміў аб тым, што з сёняшняга дня ўзмацненца кантроль над усёй вытворчасьцю.

Культсэктару фабкому даручана ў пяцідзённы тэрмін распрацаваць рад канкрэтных мерапрыемстваў у галіне паступоўі палітыка-выхаваўчай працы сярод новых рабочых, прыстасаваўшы яе да ўмоў зьменнае работы на фабрыцы.

Нарэшце, — і гэта самае жывое і характэрнае для ўзмацненых дзён «штурму» — на сходзе начуліся далёка не адзінкавыя галасы:

— Заставіся на фабрыцы да канца пяцігодкі!

На агульна-фабрычным мітынгу гэтыя галасы парадзілі рэальную справу. Абутковая не пажадала застацца ў арэргардзе. Ёсьць цяпер і ў яе арганізаваны батальён ударнікаў-энтузіястых!

Гады на целе фабрыкі павінны быць загоены да 1-га кастрычніка.

Юр. Л—ны.

Рабкоры—на штурм прарываў

Пачынаем усебеларускую пераклічку рабселькораўскіх радоў

НА ЗЬЛЁЦЕ РАБКОРАЎ МЕНСКУ

Адозва ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б ад 3 верасьня і ўсесаюзны рабкораўскі паход ставяць перад рабселькорамі **вельмі адказныя і баявыя задачы.** Рабселькоры ня могуць стаяць у баку ад таго вялікага ўздыму рабочае клясы, які зараз выкліканы ў сувязі з адозвай ЦК партыі па ліквідацыі прарываў, па выкананьні і перавыкананьні прамфінпляну.

Ад рабселькораў зараз патрабуецца больш асабістага прыкладу, больш адданасьці справе па ажыцьцяўленьні лёзунгу «Пяцігодка — за чатыры гады». Новыя вышэйшыя формы сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва павінны быць у першую чаргу ўсьвядомлены рабселькорамі. **У любы момант рабселькор павінен даць адказ, растлумачыць элемэнтарную сутнасьць кожнаму рабочаму ўдарніку тых новых вышэйшых форм сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, у якіх ён прымае ўдзел.**

Вось чаму пытаньні, высунутыя перад рабкорамі Менску у дакладах т.т. Гольдштэйна і Курціка на зьлёце 11-га верасьня, выклікалі вялікую зацікаўленасьць. Праўда, ня ўсе рабкоры Менску ўлічылі важнасьць пытаньняў, высунутых на зьлёце, бо зьявілася нязначная колькасьць. На рабкораўскім зьлёце былі прымушаны канстатаваць прарыў, які выявіўся ў нязначнай яўцы рабкораў на зьлёт. Гэты прарыў павінен быць у далейшым ліквідаваны.

На зьлёце таксама прыхіхітваюць рабкоры буйнейшых прадпрыемстваў Віцебску, якія прыехалі на Усебеларускую выстаўку. Яны гатовы рапартаваць з ходу, як на віцебскіх прадпрыемствах рэалізавана адозва ЦК партыі. Рабкоры Віцебску ведаюць аб прарывах на паняровай фабрыцы «Чырвоная Зорка», гарзаўні імя Лекерта, мэдпроме і аб цякучасьці рабочай сілы на «Дзьвіне».

Спрэчкі, разгорнутыя на дакладах, яшчэ больш пераконваюць у тым, што рабкоры разумеюць свае задачы. Яны правільна выкарыстоўваюць сваю зброю — вострае пяро — для змаганьня з расхлябанасьцю, апартунізмам, для зьнішчэньня ўсіх перашкод на шляху выкананьня другога году пяцігодкі.

Рабкор **Зорэс** падаваў факты выяўленьня 3.500 футаў сапсаванай хромавай скуры на абутковай фабрыцы ў Менску. Некалькі соцень пар гатовага абутку ляжыць на фабрыцы і на выпускаецца а-за адсутнасьці гвазуры. Рабкоры **Кісонс** (дуркарня БДВ), **Раманаў** (зав. «Камунар») і **Яхновіч** (зав. «Дрэвапрадпушчык») рэзка крытыкавалі погляды некаторых рабкораў, якія сьцьвердзілі паніку, што пісаць небясьпечна, бо за гэта зваольняць з работы. Яны расказваюць, як фабрычна-заводзкія газэты змагаюцца з ліквідацыяй прарываў. Гэтыя рабкоры скардзіліся на тое, што цэнтральныя газэты «Зьвязда», «Рабочий», шырока асьвятляючы прарывы, у той-жа час заметкі аб ліквідацыі прарываў зьмяшчаюць з вялікім спазьненьнем.

Тав. **Цудзін** («Зьвязда») падаваў факты аб тым, што рабочыя ўдарнікі зав. «Энергія» з-за адсутнасьці растлумачальнай работы цэхавых камітэтаў, ня ведаюць, што такое «сквозная» брыгада, сустрэчны прамфінплян. Ён адзначае, што на шмат якіх прадпрыемствах ударніцтва праводзіцца парадныя разяўлоцкімі, але ніхто не празрае як яно ажыцьцяўляецца. Кожны ўдарнік паміжен ня толькі сам дасканала ведаць сутнасьць сустрэчнага прамфінпляну, «сквозной» брыгады, грамадзкага буксіру, але ён павінен у любы момант растлумачыць аб гэтым кожнаму рабочаму-ўдарніку. І тут задача кожнага рабкора, дзе-б ён не працаваў, быць арганізатарам сустрэчнага прамфінпляну, «сквозной» брыгады і грамадзкага буксіру. Кожны рабкор павінен праводзіць растлумачальныя гутаркі з рабочымі ўдарнікамі аб сутнасьці гэтых новых вышэйшых форм сацсаборніцтва і ўдарніцтва. Расхлябанасьці ў рабкораўскіх радох быць ня можа. Рабкоры павінны першыя пакончыць з усякімі спазьненьнямі на сходы. Наведваньне усіх сходаў і нарад для кожнага рабкора павінна быць абавязковай і адказнай задачай, бо праз гэтыя сходы і нарады цэнтральныя газэты высоўваюць перад рабкорамі важнейшыя баявыя задачы для і даюць ім новыя заданьні для асьвятленьня ў нізавым друку і арганізацыі рабкораўскіх функцый сярод шырокіх рабочых мас.

Выступаўшыя ў спрэчках **Лявоненка** (ЦК саюзу друкароў), **Лаўковіч** («Зьвязда») сьцьвердзілі выключна на задачах, якія стаяць перад рабкорамі ў сувязі з усесаюзным рабкораўскім паходам.

Рабкоры пастанавілі зараз-жа разгарнуць шырокую кампанію сярод рабкораў па прадпрыемствах і ўстановах аб уключэньні ва ўсесаюзны рабкораўскі паход. У бліжэйшыя дні склікаць аб'яднаньні сходы буйнейшых прадпрыемстваў, на якіх абраць лепшых ударнікаў на ўсесаюзны штаб рабкораўскага паходу. На ўсіх прадпрыемствах і ўстановах гор. Менску абгаварыць ухваленую рабкораўскім сходам рэзалюцыю аб уключэньні ва ўсесаюзны рабкораўскі паход.

Ц.

Усе рабкоры—у рады ўдарнікаў, ўсе ўдарнікі—у рады рабкораў

(З РЭЗАЛЮЦЫІ АГУЛЬНАГА СХОДУ РАБКОРАЎ)

У гэтыя рашаючыя дні, што засталіся да канца другога году пяцігодкі, роля кожнага рабкора значна павялічваецца. Кожны рабкор, дзе-б ён ні працаваў, павінен змагацца з ліквідацыяй прарываў, за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Усе мы рабкоры становімся ў рады ўдарнікаў. Бярэм на сябе абавязак быць арганізатарамі і ўдзельнікамі новых вышэйшых форм сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Дапамагчы асабістым прыкладам у арганізацыі сустрэчнага прамфінпляну, «сквозных» ударных брыгад, грамадзкага буксіру, плянавагапэрацыйных груп.

Мы, рабкоры гор. Менску, мабілізуем сябе на ліквідацыю прарываў, на змаганьне за сустрэчны прамфінплян і на падрыхтоўку да трэцяга году пяцігодкі. Яшчэ нічыйней згуртуемся навакол бальшавіцкага друку, стварэючы ўдарныя брыгады з рабкораў-ударнікаў на дапамогу тым, хто адстае, на выкрыцьцё расхлябанасьці, апартуніэму і панікёрства. З бальшавіцкай рашучасьцю будзем змагацца з «лятунамі», рвачмі і прагульнічыкамі.

Мы, рабкоры гор. Менску, уключаемся ва ўсесаюзны паход і заклікаем усіх рабкораў ВССР пасьледаваць нашаму прыкладу. Выканаць рэвалюцыйны абавязак кожнага рабкора. Стаць у першых радох на рэалізацыі адозваў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)В.

Арганізуем на ўсіх прадпрыемствах апорныя рабкораўскія пункты газэт «Зьвязда» і «Рабочий», праз якія яшчэ больш мабілізуем увагу рабкораў і ўдарнікаў на ліквідацыю прарываў, на выкананьне прамфінпляну. Яшчэ з большай падрыхтаванасьцю сустрэнем трэці пяцігодкі.

Наш сёняшні баявы лёзунг павінен быць — усе рабкоры ў рады ўдарнікаў, усе ўдарнікі — у рады рабкораў.

На раённых партыйных канфэрэнцыях

Рэчыца

Гэтымі днямі адбылася **сёмая партыйная канфэрэнцыя Рэчыцкага раёну.**

Побач з пытаньнямі аб ходзе хлебазагатоўчай і асеньняй пасеўнай кампаніі канфэрэнцыя абмеркавала адозву ЦК УсеКП(б).

З вялікай прамовай выступіў член бюро ЦК КП(б)Б **т. Рапапорт,** які спыніўся на чарговых задачах партыі. У часе канфэрэнцыі з калгасаў і вёсак пачалі **прыбываць чырвоныя абозы,** якія здалі 150 тон збожжа. Дэлегаты канфэрэнцыі віталі чырвонаабозьнікаў. На прыёмачных пунктах адбыліся мітынгі.

У той-жа час на канфэрэнцыі быў зачытан **рапарт нядаўна арганізаванага калгасу імя Будзёнага.** Гэты калгас арганізаваўся з 4-х батрацкіх, 6 бядняцкіх і 2 серадняцкіх гаспадарак у былым кулацкім пасёлку.

Канфэрэнцыя закончылася выбарамі кіруючых органаў. Сакратаром райкому выбран **т. Кухарэнкін,** старшынёю **т. Левін.**

КАЖАМЯКІН.

Астрашыцкі Гарадок

5-га верасьня ў **Астрашыцкім Гарадку** адбылася раённая партыйная канфэрэнцыя, якая падвяла вынікі праведзенай работы. Канфэрэнцыя канкретна вызначыла мерапрыемствы для хутчэйшага зьніжэньня выяўленых недахопаў.

У спрэчках выступіў **сакратар ЦК КП(б)Б т. Васілевіч.**

Тав. Васілевіч спыніўся на задачах партыйнай раённай арганізацыі ў сувязі з ліквідацыяй акругі і адзначыў, што па раённыя арганізацыі ўскладаецца яшчэ большая адказнасьць і ад іх патрабуецца дакладная канкрэтызацыя кіраўніцтва ў адносінах да кожнага саўгасу, калгасу, вёскі і г. д. Побач з пакіраваньнем 90 проц. акруговых работнікаў у раёны, павінна ва ўсю шырыню стаяць пытаньне аб выкананьні калгасьнікаў, батракоў, беднякоў на адказную кіруючую работу. Асноўная задача партыі на вёсцы—арганізацыя бядняцка-серадняцкага руху ў калгасы.

У склад райкому абрана 13 членаў і 4 кандыдаты. У склад РКК—5 членаў, і ў рэвізійную камісію—3.

Гарадок

Праваапартуністычныя вылазкі на Гарадоцкай райпартканфэрэнцыі

На парадку дня гарадоцкай райпартканфэрэнцыі, якая адбылася 6-га верасьня, быў пастаўлен адзін даклад аб уборачнай кампаніі, загатоўках, асеньняй слубе. У спрэчках выказалася больш 20 чал., а запісалася больш 40.

У спрэчках мелі месца некалькі праваапартуністычных выступленьняў. Некаторыя з выступаўшых таварышоў правялі апартуністычнае нявер'е і паніку перад труднасьцямі. Гэтыя апартуністыя гаварылі, напрыклад, што «мы ня справімся з уборкай, бо не хапае рабочых рук», што «цяны загатоўкі рыбы надта вялікія» і г. д.

Канфэрэнцыя асудзіла гэтыя праваапартуністычныя выступленьні і дала ім бальшавіцкі адпор.

Канфэрэнцыя абвясьціла сябе мабілізаванай на правядзеньне бягучых кампаній.

Канфэрэнцыю віталі прадстаўнікі Чырвонай арміі, камсамолу, прафсаюзу, калгасьнікаў. Калгасьнікі паднесьлі падарунак канфэрэнцыі—чырвоныя абозы з фруктаў і гародніны для рабочых Віцебска.

Канфэрэнцыя закончыла сваю работу выбарамі кіруючых органаў.

На аб'яднаным пленуме папава абраных РК і РКК выбраны сакратаром райкому **тав. Райсін,** старшынёй РКК **тав. Мілюнас.**

П—р.

Слуцкая прафтэхшкола бяз сырцу

З-за гапавацяпства зрываецца навучальны год

Да новага навучальнага году засталіся лічаныя дні, а слуцкая прафшкола і дагэтуль без сырцу. Калі для мэталічнага цэху ёсьць нязначная колькасьць сырцу, дык дрэваапрацоўчы цэх зусім ня здолее пачаць навучальнага году з-за адутнасьці матар'ялу.

Хто-ж вінаваты ў падрыве навучальнага году? Буду гаварыць фактамі.

Бабруйскі акрінспэктар парасьветы **Пакроўскі** атрымаў для прафшколы ад Наркамасьветы (дзякуючы хадайніцтву прафшколы) 53 куб. мэтры лесматар'ялу і запатрабаваў заяўку ад гэтай школы. Школа дала зараз-жа (28-III) заяўку аб водпуску ёй 27 кубамэтраў лесматар'ялаў. Але... і цяпер не атрымала ні матар'ялу, ні адказу.

Школа некалькі раз пыталася аб гэтым—адказу-ж не атрымлівала.

13-VIII быў пасланы прадстаўнік ад школы, каб даведацца ад лёсе перапіскі і матар'ялу. Аказалася, што ўвесь лес—53 кубамэтры,— аддадзен Бабруйскай прафшколе. Слуцкая так і засталася бяз лесу.

Цікава, што перапіска пачата школай з 22 лютага, але справа наперад і дагэтуль не пасунулася. Апошні свой ліст школа паслала бабруйскаму АВК і копію акруговай РСІ.

6-VII АВК прапанаваў інспэктару даць тлумачэньне на сутнасьці справы. Але з 13-VIII спадар Пакроўскі з'ехаў у Гарадок. Ясьць цяпер і ў яе арганізаваны батальён ударнікаў-энтузіястых!

Гады на целе фабрыкі павінны быць загоены да 1-га кастрычніка.

Р-кр.

Манэўры скарыстаем для агляду вайсковай работы на вёсцы

Чырвоныя байцы дапамагаюць калгасам і саўгасам азнаёміцца з новай тактыкай і тэхнічнымі сродкамі бою

Калгасы і саўгасы падрыхтуем да манэўраў

У раёне манэўраў многія калгасы і саўгасы будуць цесна зьвязаны з часьцямі Чырвонай арміі.

Нашы калгасы і саўгасы зьяўляюцца апорнымі пунктамі ўсёй работы партыі на вёсцы, у тым ліку і вайсковай. Зусім зразумела, што наш сацыялістычны сэктар вёскі павінен узмоцнена рыхтавацца да манэўраў і разгарнуць на колі манэўраў шырокую растлумачальную кампанію, якая ўзмоцніць вайсковую работу ў калгасах і саўгасах.

Асноўная задача—гэта растлумачэньне мэт і задач манэўраў, падрыхтоўка насельніцтва да іх і барацьба з усімі пляткамі і чуткамі, якія распаўсюджваюцца кулакамі і папамі вакол манэўраў.

Трэба кожнай калгаснай і саўгаснай ячэйцы Асоавіяхіму выкарыстаць знаходжаньне часьцей Чырвонай арміі для агляду і праверкі сваёй вайсковай работы. Трэба арганізаваць вечар змычкі з Чырвонай арміяй, дзе даць справаздачу аб сваёй рабоце ў справе ваяізацыі. Гэтым самым трэба прасунць удзел партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных і грамадзкіх арганізацый у справе ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны.

Трэба даць справаздачу аб сваёй рабоце па падрыхтоўцы да прызыву 1908 году, расказаць, якую дапамогу аказалі за гэты год сем'ям чырвонаармейцаў, як прайшла ўборка «гэктару абароны», ці сабраны першы сноп у фонд абароны, як уцягнуты ў работу дэмабілізаваныя чырвонаармейцы і пераменьнікі. Асабліва цікава ведаць аб іх непасрэдным удзеле ў справе сацыялістычнай перабудовы вёскі.

У тых калгасах і саўгасах, дзе выпускаюцца свае пасьценныя або шматтыражныя газэты, трэба ўжо цяпер пачаць падрыхтоўку да манэўраў і агляд сваёй вайсковай работы.

Яшчэ адна з важных задач—гэта бліжэй пазнаёміцца з ваеннай тэхнікай. Трэба ўкараніць у сьвядомасьць кожнага калгасьніка, кожнага селяніна, кожнага асоавіяхімаўца, што гэта вялізарнае тэхнічнае азначэньне арміі праведзена толькі дзякуючы правільнай ленінскай лініі партыі на індустрыялізацыю краіны. Магутнае тэхнічнае аснашчэньне арміі гэта дзеяшча індустрыялізацыі краіны. Там, дзе будуць непасрэдна праходзіць манэўраныя апараты, неабходна пазнаёміць калгасьнікаў і рабочых саўгасаў з абстаноўкай сучаснага бою, з новай тактыкай і прыстасаваньнем у баі тэхнічных сродкаў барацьбы.

Гэтае азнаямленьне дасьць выразнае ўяўленьне аб вялізарным росьце баявой магутнасьці Чырвонай арміі і павысіць ваенную граматнасьць рабочых саўгасаў і калгасаў.

Усё гэта, безумоўна, выкліча вялікую зацікаўленасьць да ваеннай вучобы, зблізіць сялян, калгасьнікаў і рабочых саўгасаў з Чырвонай арміяй.

Гэты пералом трэба замацаваць лепшай пастаноўкай асоавіяхімаўскай работы, уцягненьнем новых членаў у рады Асоавіяхіму і агульнай увагай да далейшай работы па ўзмацненьні абароназдольнасьці Савецкага Саюзу.

На манэўрах выканаць і перавыканаць плян баявой вучобы

Адозва ЦК УсеКП(б) ад 3 верасьня і пастанова прэзыдыуму УсеЦСПС аб «дні ўдарніка» знайшла жывейшы водгук у часьцях РСЧА.

Палітычнае кіраўніцтва РСЧА дало дырэктыву аб тым, каб адозва ЦК УсеКП(б) была шырока папулярызавана сярод усяго складу чырвонаармейцаў і камандзіраў.

На аснове таго, што адозва мае вялізарнае значэньне для ўсяе справы сацыялістычнага будаўніцтва і абароны нашага краю, трэба мабілізаваць чырвонаармейскую масу і начскладу на выкананьне і перавыкананьне плянаў баявой вучобы, дасягненьне высокай якасьці баявой падрыхтоўкі, яшчэ большае павышэньне клясавай пільнасьці і далейшае ўцягненьне мас ва ўдарніцтва.

Пад гэтымі лозунгамі часьці Чырвонай арміі і павінны праводзіць манэўры, якія падагуляць вынікі гадавой баявой вучобы.

Весткі, якія ўжо ёсьць аб падрыхтоўцы ў часьцях да манэўраў, гавораць аб вялізарным росьце палітычнай актыўнасьці чырвонаармейцаў, што ўжываюць у сябе ў часьцях новыя формы і мэтады сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Чырвонаармейцы бяруць прыклад з перадавых рабочых Савецкага Саюзу і скарыстоўваюць у сябе вопыт стварэньня «сквозных» брыгад, грамадзкага буксіру і збору чырвонаармейскіх прапаноў, дабіліся вялізарнага перавыкананьня статутных норм у радзе васенных дысцыплін.

Падрыхтоўка да манэўраў захапіла чырвонаармейцаў і яны з энтузіязмам працуюць у «сквозных» брыгадах, выяўляючы ўсе недахопы, што перашкаджаюць больш выразнай падрыхтоўцы да манэўраў.

Наколькі ўмела і хутка праламляюць чырвонаармейцы вопыт перадавых пралетараў відаць з таго, што ў 7-й кавдывізіі за день да адкрыцьця дывізыйнага зьлёту ўдарнікаў камсамольская брыгада ў адным палку сабрала больш 300 чырвонаармейскіх прапаноў па лепшым праведзеньні падрыхтоўкі да манэўраў і самых манэўраў.

Гэты вялізарнейшы ўздым актыўнасьці чырвонаармейскіх мас зьявляецца гарантыяй таго, што манэўры будуць праведзены з вялікім посьпехам і дадуць нам перавыкананьне плянаў баявой вучобы.

ВАЗІН.

Чырвоны Крыж у справе ўзмацненьня абароназдольнасьці СССР

Аб тым, як мы падрыхтаваны да абароны краіны нельга рабіць вынікаў на падставе толькі посьпехаў Чырвонай арміі, а мы здолеем зрабіць гэтыя вынікі тады, калі да падрыхтаванасьці Чырвонай арміі дадамо падрыхтаванасьць усёй складанай сыстэмы тылу, якой зьяўляецца уся наша краіна Саветаў.

У перыяд манэўраў Чырвонай арміі і ўся пралетарская грамадзкасьць павінны паказаць, як яны практычна ажыцьцяўляюць пастановы XVI зьезду нашай партыі, які паставіў задачу яшчэ большай мабілізацыі сіл рабочае клясы і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі ў справе ўзмацненьня абароназдольнасьці СССР.

Арганізацыя Чырвонага Крыжу БССР разам з іншымі нашымі пралетарскімі арганізацыямі будзе трымаць гэтыя іспыты на выкананьні дырэктыў партыі.

Чырвоны Крыж у надыходзячых манэўрах павінен будзе разгарнуць рад лекава-прафілактычных установаў, эвакапунктаў, доктарскіх пунктаў, амбулаторый, пунктаў першае дапамогі, лазьні і г. д., якія павінны сваёй работай дапамагчы санітарным органам Чырвонай арміі выканаць задачу па мэдсанабслугоўваньні.

Чырвоны Крыж разам з Асоавіяхімам павінен выканаць рад задач па хэмічнай абароне.

ЗАВОД ІМЯ ЛАНЦУЦКАГА НА ГРАМАДЗКІМ БУКСІРЫ

Чаму ліцейшчык „Пралетара“ дае у два разы больш ліцьця?

Вагранка, якая прымушае цэх атрымліваць па-зачарговы водпуск

Кваліфікаваныя рабочыя на дапаможнай рабоце

Першыя крокі сустрэчнага на заводзе імя Ланцуцкага

Завод „Пралетары“ выканаў праграму за першую дэкаду верасьня на 132,8 проц. і на 102,4 проц. павялічаную праграму, складзеную з разьлікам на ліквідацыю прарыву.

Ліцейшчык заводу імя Ланцуцкага т. РАБЧЭНКА ХВЕДАР, які замест сярэдняй нормы ў 24 буксы фармуе 42 буксы.

8 верасьня брыгада грамадзкага буксіру заводу «Пралетары» прышла на завод імя Ланцуцкага для выканьня даручаных ёй абавязкаў. Брыгада паранылa спачатку растлумачыць рабочым заводу імя Ланцуцкага, што такое грамадзкі буксір, што буксір **не павінен выклікаць пачуцьця крыўды і зьнявагі.** Завод «Пралетары» паслаў сваіх лепшых ударнікаў падзяліцца вопытам сустрэчнага прамфінпляну і «сквозных» брыгад і дапамагчы рабочым заводу імя Ланцуцкага аўладаць новымі мэтадамі сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва для выканаьня прамфінпляну бягучага году і падрыхтоўкі да сустрэчны трэцяга пяцігодкі.

Паводле практыкі прапрацоўкі сустрэчнага прамфінпляну на заводзе «Пралетары» брыгада пераканалася, што пачынаць трэба **з чыгуна-ліцейнага цэху,** бо без павялічэньня прадукцыі гэтага асноўнага цэху нельга дабіцца росту прадукцыі і па іншых цэхах. Таму брыгада парашыла не распыляцца, а ўзяць у першую чаргу на грамадзкі буксір чыгуна-ліцейны цэх.

Пануюць старыя тэмпы

З дапамогай саміх ліцейшчыкаў буксірная брыгада азнаёмілася з работай гэтага цэху. У бягучым годзе рост прадукцыі па ліцейным цэху складае **ўсяго 8 проц.** супроць першага году пяцігодкі. Такі **мізэрны рост** тлумачыцца выключна бюракратызмам органаў НКШЗ. Прыблізна ў канцы першага паўгодзьдзя бягучага году была ўзята лінія па згортваньне работы заводу, бо органам НКШЗ **здавалася,** што яны змогуць выкарыстаць усю прадукцыю заводу для патрэб транспарту. Лепшыя кваліфікаваныя рабочыя былі звольнены. У красавіку і маі ў ліцейным цэху працавала 65 чалавек, у той час, як зараз працуе 123 чал.

Гэтыя тэмпы адчуваюцца яшчэ і зараз, ня гледзячы на тое, што завод пераданы ў веданьне ВСНГ. **Белмэталяб'яднаньне не стварыла патрэбнага перапому на заводзе.** Як і раней, завод, які налічвае 2½ тысячы рабочых, абслугоўваецца **адной вагранкай.** Як і раней, калі патрэбен рамонт вагранкі, трэба распускаць увесь цэх у адначынак. У той час, як завод «Пралетары», на якім працуе ўсяго 1.000 рабочых, мае дзьве вагранкі, завод імя Ланцуцкага мае толькі адну. Гэта, зразумела, ненармальна. Адсюль, калі «Пралетары» дае **штодзенную** адліўку, завод імя Ланцуцкага—**адну адліўку ў два дні.** Фармовачная плошча на заводзе «Пралетары» эксплёатуецца штодзенка, на заводзе імя Ланцуцкага—раз у два дні. Апокі на «Пралетары» выкарыстоўваюцца штодзена, на заводзе Ланцуцкага раз у два дні. У выніку **адзін кв. мэтр фармовачнай плошчы на заводзе імя Ланцуцкага дае ў год паўтары тоны ліцьця, а той жа кв. мэтр плошчы на заводзе «Пралетары» дае ў гэтым годзе 3½ тоны ліцьця, а паводле сустрэчнага прамфінпляну—4,1 тоны.** Такім чынам прадукцыйнасьць чыгуна-ліцейнага цэху заводу імя Ланцуцкага можа быць павялічана **на 100 проц.,** калі завод паставіць яшчэ адну вагранку, аб якой гутарка ідзе ўжо **амаль тры гады.** Праўда, цядаўна да гэтай работы прыступілі. Але склянали дзьве царгі **і кінулі,** апраўдваючыся тым, што кацельшчыкі заняты, не хапае жалеза і г. д.

„Кепскія настроі“ і плян

Таксама трэба пагаварыць аб **працдысцыпліне** ў ліцейным цэху, аб некаторых шкодных настроях па асобных адсталых рабочых. Калі рабочыя ліцейнага цэху абмяркоўвалі сустрэчны прамфінплян, адзін ліцейшчык заявіў, што ён супроць таго, каб давесьці прамфінплян да варштату, бо гэта будзе абавязваць рабочага выконваць плян. «А ў мяне, бачыце, часамі бывае кепскі настрой і работа ня ідзе. Лепш працаваць, як цяпер—бяз пляну, колькі зрабіў, столькі і добра». Другі дадаў, што ён працаваў на заводзе «Пралетары» і пакінуў работу, бо там рабочыя вельмі часта добраахвотна зьніжаюць расцэнкі. Адразу відаць, што **заводзкія арганізацыі не вядуць сярод рабочых патрэбнай растлумачальнай работы.**

Прагулы за жнівень складаюць 22 рабочых дні. Колькасьць спазьненьняў на работу—63. Есьць злосныя прагульшчыкі, як рабочы **Каптураўскі,** які мае ў жніўні два прагулы і 5 спазьненьняў.

Страты рабочага часу яшчэ вельмі вялікія. Старыя кваліфікаваныя ліцейшчыкі **палову свайго рабочага дня** працуюць **не па сваёй кваліфікацыі,** таму, што адзін вучань прыпадае на 32 кваліфікаваных рабочых і старыя ліцейшчыкі прымушаны шмат часу аддаваць на **дапаможныя работы.** А калі ў 1930-31 годзе трэ' будзе павялічыць колькасьць ліцейшчыкаў на 12 чалавек, заводакіраўніцтву прыдзецца, відавочна, самому замяніць ліцейшчыкаў, **бо падрыхтоўка кадраў не вядзецца.**

Цяжкі груз на сабекошце

Цікава параўнаць работу двух ліцейных цэхаў—заводаў «Пралетары» і імя Ланцуцкага. Выпуск шасьцёркі да растворамяшалак на «Пралетары» **каштуе 80 кап.,** а на заводзе імя Ланцуцкага **1 руб. 25 кап.** Таму, што на «Пралетары» гэтую шасьцёрку робяць рабочыя з разраду, а на заводзе імя Ланцуцкага—**рабочыя 7 разраду.** І характэрна, што, ня гледзячы на гэта, заработак рабочага трэцяга разраду на «Пралетары» **складае ў сярэднім у месяц 165 р.,** а заработак рабочага 7 разраду на заводзе імя Ланцуцкага—**160 руб.** Вось, што значыць **правільная арганізацыя працы!**

Яшчэ горш стаіць справа ў медна-ліцейным цэху. Тут фармаўшчык 7-8 разраду **сам робіць шышкі,** у той час, як на «Пралетары» на гэтай лёгкай рабоце скарыстоўваюцца **жанчыны 2-3 разраду.** Рацыянальнае скарыстаньне кваліфікаванай рабочай сілы і добрая пастаноўка вучнёўства дадуць магчымасьць значна павялічыць выпуск прадукцыі і высунуць сустрэчны прамфінплян, які значна перавысіць кантрольныя лічбы.

Пры актыўнай дапамозе саміх ліцейшчыкаў

Трэба падкрэсьліць, што **ўсе гэтыя моманты былі выяўлены брыгадай грамадзкага буксіру пры актыўнай дапамозе саміх ліцейшчыкаў заводу імя Ланцуцкага.** Калі брыгада зрабіла вывад, што трэба павялічыць колькасьць вучняў, **ліцейшчыкі з гэтым адразу згадзіліся. Кожны ліцейшчык згадзіўся ўзяць сабе вучня.** Характэрна, што некаторыя ліцейшчыкі, у сувязі з гэтым, **ужо ставяць пытаньне аб добраахвотным зьніжэньні расцэнак, бо разам з вучнямі яны будуць выпускаць прадукцыі амаль у два разы больш.** Гэта на спра давёў ліцейшчык **т. Рабчэнка.** Ня гледзячы на тое, што ліцейшчыкам ён працуе нядаўна (раней быў чорнарабочы), ён замест 24 буксаў у дзень зараз выробляе 42 буксы. Такога павялічэньня выпуску прадукцыі здолеес дабіцца **ножны ліцейшчык,** калі ён толькі гэтага захоча.

Першае слова ліцейшчыкаў

Трэба сказаць, што за апошнія дні ў **сувязі з адозвай ЦК УсеКП(б),** на сводзе наогул наглядаецца **вялікі ўздым рабочай актыўнасьці.** Ліцейшчыкі ўжо прад'явілі свой сустрэчны прамфінплян. Пакуль што **замест 2½ тысяч тон, ліцейны цэх прапануе выпусьціць 3.000 тон.** Але гэта толькі пачатак. Мы ўпэўнены, што выявіўшы **ўсе скрытыя рэсурсы,** ліцейшчыкі, а таксама ўвесь калектыў заводу імя Ланцуцкага, высунуць **сапраўдны сустрэчны прамфінплян на падставе сапраўдных вытворчых магчымасьцяй заводу.**

Адміністрацыя заводу імя Ланцуцкага **ўжо асыгнавала 3.000 руб. для прэм'яваньня лепшых ударнікаў—актыўных удзельнікаў складаньня сустрэчнага прамфінпляну.** Ужо адданы загад, каб у ліцейным цэху прыняць пакуль што **10 вучняў.** Па ўсіх цэхах вылучаны **таварыскія суды** для барацьбы з прагульшчыкамі. Перадавыя цэхі бяруць тых, хто адстае, на грамадзкі буксір. Рабочыя масамі падаюць заявы з абавязацельствамі—**не пакідаць заводу да канца пяцігодкі.** Прымаюцца рашучыя крокі для паляпшэньня грамадзкага харчаваньня.

Перад брыгадай грамадзкага буксіру стаіць вялікая і складаная задача—дапамагчы рабочым заводу імя Ланцуцкага шляхам абмену практыкай з заводам «Пралетары» узьняць сацэпаборніцтва і ўдарніцтва на большую вышыню. З гэтай задачай буксірная брыгада справіцца толькі тады, **калі ўсе рабочыя заводу імя Ланцуцкага зразумеюць ролю і значэньне бурсірнай брыгады, зразумеюць, што буксірная брыгада, змагаючыся за бальшавіцкія тэмпы работы на заводзе імя Ланцуцкага, мае на мэце выключна інтарэсы ўсёй сацыялістычнай прамысловасьці, інтарэсы саміх рабочых заводу імя Ланцуцкага.**

Буксірная брыгада

Залежы пому на заводзе імя Ланцуцкага, якія магчыма і трэба скарыстаць.

Гэраізм нашых дзён

Выратавалі фабрыку ад прастояў

БАРЫСАЎ. (Па тэлефону). У сувязі з напружаным становішчам фабрык «Чырвоная Бярэзіна» і «Пралетарская Перамога» (невялікі запас сыру з прычыны недахвату фурманак для падвозкі асіны), партарганізацыя фабрык паладзіла **суботнік.** Каля 200 партыйцаў і беспартыйных на працягу 5 гадзін **праклалі вузкакалейку** — ад чыгуначнай веткі да фабрыкі на адлегласьці **250 мэтраў.** На суботніку асабліва сябе праявілі арганізаваныя гэтымі днямі **ўдарныя брыгады імя 3-га году пяцігодкі.** Вузкакалейка дасьць магчымасьць паскорыць падвозку асіны і паменшыць колькасьць фурманак.

Апошнія дні фабрыкі таксама працуюць з перабоямі з прычыны адсутнасьці патрэбнай колькасьці пары. Паравы кацёл 9 месяцаў ня чысьціўся, каласьнікі перагарэлі і выбылі са строю. Рамонт катла меркавалася закончыць **праз 4-5 дзён.** Але **ўдарная брыгада сьлесароў імя 3-га году пяцігодкі** на зьлёце партарганізацыі дала абяцаньне **на працягу 36 гадзін адрамантаваць топкі катла.** 15 ударнікаў пад кіраўніцтвам **інжынэра Бэрмана і старшага тэхніка Мамонава** свае абяцаньні выканалі. **Праз 36 гадзін кацёл пачаў функцыяваць.**

Брыгада «Зьвязды» ФАЛЬКО, КАВАЛЁЎ.

12 энтузіястых

На працягу раду гадоў 499 кілёмэтр (таварны паўстанак у 3 кл. ад Менску) быў месцам, дзе памаліся аўтамашыны, фурманкі, дзе коні грузьлі ў балоце і г. д.

За апошнія месяцы дарога да 499 кілём. зусім спасвалася і амаль што ні коннм, ні пехатой нельга было дайсьці да складаў, якія там знаходзяцца.

ЗВЫШ 100 ВАГОНАЎ ВУГАЛЮ І ДРОЎ НАБРАЛАСЯ ЗА АПОШНІЯ ДНІ НА 499 КІЛЁМЭТРЫ.

За 1 клм. ад паўстанку знаходзіцца ЦАГЕЛЬНЫ ЗАВОД № 3, які быў напярэдадні астаноўкі з-за адсутнасьці апалу. У той час, калі на 499 кілёмэтры стаяла звыш 40 вагонаў вугалю, прызначанага для гэтага заводу.

Усе намаганьні праўленьня Саюзтрансу аб рамонце дарогі разьбіваліся аб бюракратызм устаноў, якія абяцалі прысылаць людзей, але не прысылалі.

11 верасьня старшыня праўленьня Саюзтрансу т. КЕЙЛІН на агульным сходзе грузчыкаў паставіў пытаньне аб тым, што рабіць для пачынкі дарогі і вывазкі грузу.

БРЫГАДА ЭНТУЗІЯСТЫЯЎ У СКЛАДЗЕ 12 ЧАЛАВЕК пастанавіла НЕ ЧАКАЦЬ ПРЫСЫЛКІ ЛЮДЗЕЙ, а заўтра-ж ДА РАБОТЫ адрамантаваць дарогу і даць магчымасьць грузавікам прыступіць да выгрузкі вагонаў.

На заўтра а 5 г. раніцы брыгада была ўжо на месцы і прыступіла да работы. А ПАЛОВЕ ДЗЕВЯТАЙ РАНІЦЫ ДАРОГА БЫЛА АДРАМАНТАВАНА і грузавікі змаглі пачаць выгрузку. ЗА 4 ГАДЗІНЫ брыгада энтузіястых зрабіла тое, на што трэ' было НЯ МЕНШ 3 ДЗЁН. 12-га грузавікі ўжо вывезьлі звыш 60 ТОН ГРУЗАЎ.

Вось прозьвішчы энтузіястых:

Кіраўнік брыгады — шофэр — выпускнік т. ДРОЗД; грузчыкі БЕЛАЗОЎСКІ, ПРЭСМАН, РАХЛІС (сакратар ячэйкі), КАЦ, ФРЫДМАН (старшыня рабачкому), ЛАЗАРЭВІЧ, БАГДАНЧЫК, ВАЙНБЭРГ і агенты МІЛЕНЬКІ, РАСКІН І РУДЗІЦЕР.

А.

250 новых ударнікаў

БАБРУЙСК 12. На Бабруйскім камбінаце прызыў ударнікаў імя 3-га году пяцігодкі даў ужо 250 ударнікаў.

За максымальныя кантрольныя лічбы

Пастанова рабкораў гуты „Пралетары“

ГЭТЫМІ ДНЯМІ НА ГУЦЕ «ПРАЛЕТАРЫ» (МЕНСК) АДБЫЎСЯ СХОД РАБКОРАЎ ЧАЦЬВЕРТАЙ ЗЬМЕНЫ. НА СХОДЗЕ БЫЛА АБМЕРКАВАНА АДОЗВА РЭДАКЦЫІ «ПРАВДА».

— ДЛЯ НАС ЗУСІМ ЗРАЗУМЕЛА, ШТО МЫ ЗАРАЗ ПАВІННЫ МАБІЛІЗАВАЦЬ УСЕ СІЛЫ НА ВЫКАНАНЬНЕ ДРУГОГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ,— ГАВАРЫЎ МАЙСТАР Т. БЛЯШКЕВІЧ.

ПАСЬЛЯ АБМЕРКАВАНЬНЯ АДОЗВЫ, РАБКОРЫ ЧАЦЬВЕРТАЙ ЗЬМЕНЫ Ў ЛІКУ 12 ЧАЛАВЕК АБВЯСЬЦІЛІ СЯБЕ ЎДАРНІКАМІ ДЛЯ ВЫКАНАНЬНЯ ПРАМФІНПЛЯНУ З-ГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ. У РЭЗАЛЮЦЫІ РАБКОРЫ ЗАЯВІЛІ: «ВУДЗЕМ ЗМАГАЦЦА ЗА МАКСЫМАЛЬНЫЯ КАНТРОЛЬНЫЯ ЛІЧБЫ І НЕ ДАЗВОЛІМ АПАРТУНІСТЫМ ЗЬМЯШЧАЦЬ ВЫТВОРЧЫЯ МАГЧЫМАСЬЦІ КОЖНАГА ВАРШТАТУ, РАЗАМ ПАЎСТАНЕМ СУПРОЦЬ СТАРЫХ НІВОЛЬШЧЫКІЎ ТЭМПАЎ У РАБОЦЕ, НЕ ДАЗВОЛІМ ПРАГУЛЬШЧЫКАМ, ГУЛЬТАЕМ, РВАЧОМ І П'ЯНІЦАМ ЗРЫВАЦЬ ПРАМФІНПЛЯН. МЫ АБАВЯЗУЕМСЯ НЕ ПАКІДАЦЬ ЗАВОДУ ДА КАНЦА ПЯЦІГОДКІ І ВЫКЛІКАЕМ РАБКОРАЎ ІНШЫХ ТРОХ ЗЬМЕН УКЛЮЧЫЦЦА Ў НАШ СЬПІС, ДАПАМОЖАМ ТАВАРЫШОМ, ЯКІЯ АДСТАЮЦЬ, ВЫКАНАЦЬ ПРАМФІНПЛЯН.

ВОСЬ АБ ЧЫМ ГАВАРЫЛІ І ШТО ПАСТАНАВІЛІ РАБКОРЫ ГУТЫ «ПРАЛЕТАРЫ».

ІХ ПРЫКЛАДУ ПАВІННЫ ПАСЬЛЕДВАЦЬ УСЕ РАБОЧЫЯ І РАБОТНІЦЫ ЗАВОДУ, КАБ РАШУЧА ВЫСТУПІЦЬ СУПРОЦЬ НЕПАЛАДКАЎ, ЯКІЯ ЯШЧЭ ЁСЬЦЬ НА ЗАВОДЗЕ.

А. М.

Да канца пяцігодкі

7-га верасьня адбыўся мітынг рабочых і служачых заводу «Ударнік» (былая фабрыка «Адраджэньне»). На мітынгу 17 рабочых вагавага цэху абвясьцілі сябе мабілізаванымі і далі абавязацельства не пакідаць заводу да канца пяцігодкі.

8 верасьня ўсе рабочыя ліцейнага цэху таксама далі такое абавязацельства і выклікалі пасьледваць іх прыкладу ліцейшчыкаў заводу «Энэргія». 22 рабочых мэханічнага цэху далучыліся да гэтай заявы.

Красік.

ХВОРЫЯ ПАРАВОЗЫ І ЗДАРОВЫЯ БЮРАКРАТЫ

загараджваюць дарогу хлебным струменьням

Аршанскі вузел толькі напалову гатовы да перавозак

ПАГРАЖАЮЧЫ РОСТ ЗДАРЭНЬНЯЎ, ПАГРАЖАЮЧАЕ ПАДЗЕНЬНЕ ПРАЦДЫСЦЫПЛІНЫ

Сёньня на аглядзе ВОРША

Асеньнія перавозкі ўжо пачаліся. Аднак, аршанскі чыгуначны вузел не падрыхтаваны да перавозак. Ён на зможа вытрымаць экзамену на выразную бесьперабойную работу па перакідцы хлебных грузаў.

Рабочая грамадзкасьць чыгункі не мабілізавана на барацьбу з прарывамі на вузьле.

НЕ ПАДРЫХТАВАЛІСЯ ДА ЭКЗАМЭНУ

Аршанскі чыгуначны вузел (3-ці раён МБВ) гатоў да перавозак толькі напалову. Яго прапускная здольнасьць не гарантуе своячасовага прыёму і адпраўленьня цягнікоў з грузамі.

Плян прадугледжвае пашырэньне пуцей вузлу. Работы ўжо даўно пачаліся. але ідуць так павольна, што ў тэрмін—да 15-га верасьня яны скончаны ня будуць.

Ня скончана пабудова пакгаузаў на ст. Ворша-Ўсходняя. Пабудавана толькі 30 проц. вызначаных перагрузачных пляцформ. Устаноўлена толькі 45 проц. вызначанай плянам колькасьці ліхтароў для асьвятленьня пуцей.

На станцыі Коханава будаўнічыя работы яшчэ толькі распачаты. Ня прыступлена да пабудовы трансфарматара на ст. Талачын.

ДРЭННА З КАДРАМІ

На час асеньніх перавозак патрэбны для 3-га раёну 37 новых машыністых, 56 памочнікаў, 40 памочнікаў начальнікаў станцый, 26 сьлесароў і адзін токар. Гэтых кваліфікаваных работнікаў рыхтуюць на спэцыяльных курсах. Але курсы разьлічаны на некалькі месяцаў, і зараз нельга зрабіць выпуск.

Патрэбны 325 грузчыкаў, заўкі на іх далі вельмі позна.

Наогул пытаньне з кваліфікаванай рабочай сілай самае балючае. Паводле сьпісаў лічыцца 100 кандуктароў, на справе-ж добра кваліфікаваных кандуктароў зпойдзешся ня больш 30, рашта—слаба ведае справу.

Цякучасьць рабочай сілы—агульная хвароба вузлу. Яна тлумачыцца перабоямі ў забесьпячэньні, няправільнай аплатай працы, разнабоямі ў расцэнках.

УРАЧЫСТЫЯ ЗАЯВЫ І САПРАЎДНАСЬЦЬ

Гэтымі днямі адбыўся пленум Вучкпрафсэкцыі, на якім стаяла пытаньне аб асеньніх перавозках. Інспэктар Сьцяпаў упэўнена заявіў, што раён падрыхтаваны да іх. Гэта заява ні больш ні менш, як «очковтирательство», бо судаклад брыгады ІТС, якая праводзіла абсьледваньне раёну, паказаў, што раён падрыхтаваны толькі на 50-70 проц.

У той час, як надзвычайна патрэбны склады, яны заняты рознымі дробнымі таварамі.

Аршанскі ЦРК заляў цэлы пакгаўз ёмкасьцю ў 20 вагонаў грузам на 3 вагоны. У Калодзішчах склад-пакгаўз заняпай; накаторыя склады ст. Менск заняты гнілой рыбай. Ня было амчэ ні аднаго квартала ў бягучым гаспадарчым годзе, які-б даў выкананьне асноўных вымяральнікаў. Гэта адно кажа, што ў часе асеньніх перавозак могуць быць вялікія прарывы. Вымяральнікі рамонту паравозаў выкананы толькі на 40 проц., вымяральнікі-сяраднага сутачнага прабегу—на 95 проц. Толькі 45 проц. цягнікоў прыходзілі і адыходзілі паводле раскладу. Асноўныя лічбы пляну не даведзены да рабочых чыгуначнікаў. Ёсьць выпадкі, калі тэхнікі ашалодку ня ведаюць іх.

ШКОДНІЦТВА ПРЫ РАМОНЦЕ

Прастоі паравозаў у рамонце сталі звычайным зьявішчам на вузьле. Якасьць рамонту нікуды ня варта. Паравоз сэрыі ОВ № 5695 пасьля прамыўкі і рамонту накіраваны на работу з напсаваным інжэктарам. 13 разоў пісалі ў дэпо аб тым, што трэба рамантаваць інжэктар, але яго ўпарта не рамантуюць.

Паравоз № 509 паданы з рамонту да цягнікоў прыходзілі і адыходзілі паводле цягніка з разрэзным на 4 частні паршнявым кальцом.

Лік хворых паравозаў дасягае 30 проц. агульнай колькасьці. Каб гэта ня кідалася ў вочы, у афіцыйных дакументах зьмяншаюць колькасьць хворых паравозаў.

Вось, напрыклад, 10-га жніўня ў сутачным рапарце паказана 10,5 проц. хворых паравозаў, на справе іх было 18 проц.

ПРАЦОЎНАЯ ДЫСЦЫПЛІНА Ў ЗАНЯПАДЗЕ

Працоўная дысцыпліна сярод рабочых і агентаў дарогі зусім у заняпадзе. Наглядаюцца нявыхады на работу з за п'янства, злачынна-дрэнныя адносіны да службовых абавязкаў, сапраўднае разгільдзяйства.

2-га жніўня з-за пядбайнасьці машыністага адбылася сутычка вагонаў. 13-га жніўня разрэзаны стрэлкі. На дрэзінах езьдзяць бяз сыгналаў. Там, дзе стаіць сыгнал, што хуткасьць цягніка не павінна быць больш 30 клм., машыністы разьвіваю хуткасьць да 50. Пры набліжэньні да станцыі машыністы разьвіваюць хуткасьць да 80 клм., што суровa забаронена.

З Менску ў Воршу паслалі матар'ялы, закупленыя ў ГЭТ'е. З-за пядбайнасьці абслугоўваючага парсанала, вагон з матар'ялам зьнік. Яго знайшлі толькі праз 20 дзён, недалёка ад Смалонску. 6-га верасьня на ст. Ворша прыбылі 2 цыстэрны—адна з мазутам для дэпо, другая—з нафтай для Нафтасындыкату. Гэтыя цыстэрны стаяць ужо 3 сутак не разгружанымі.

РАСТУЦЬ ЧЫГУНАЧНЫЯ КАТАСТРОФЫ

1 і 2 верасьня на ст. Ворша на кароткай аб'ядноючай лініі разьбіты 4 пасажырскія і 16 таварных вагонаў.

Колькасьць здарэньняў на вузьле за жнівень параўнальна з мінулым вырасла з 28 да 45. Быў такі дзень, калі было адразу 15 здарэньняў.

Пад цягнік падалі паравоз № 509. Паравоз аказаўся з разабранымі тармазамі. Падалі другі паравоз. На гэтым ня было ключоў для гаек.

Адночы падалі паравоз для цягніка на Барысаў. Машыністы знайшоў, што ў паравозе, які нядаўна вышаў з рамонту, поршневае кальцо разьбіта на тры часткі. Другога паравоза ня было. Прышлося на ім ехаць да Барысава, кожную хвіліну чакаючы катастрофы.

Пад таварныя цягнікі сыстэматычна падаюць няспраўныя паравозы. З-за гэтага расьце лік здарэньняў, выдаецца шмат ліпняга апалу.

Ніхто не бярэ з апал, няма ўліку яго выдатканьня. Некаторыя машыністы зарабляюць на гэтым. Вось, як гэта робіцца. Паравоз набраў для паездкі ў Віцебск 7.000 кілё вугалю; прыехаўшы ў Воршу, машыністы ўзяў яшчэ 6.000 кілё. Адпаведных запісаў не зрабілі. Калі машыністы здаваў вуголь у дэпо, аказалася, што ў яго 2.600 кілё лішняга вугалю. Ён атрымаў прэмію за эканомію апалу.

Часамі дзейнасьць адміністрацыі патурае здарэньням. Нядаўна ў кантору раёну зьявіўся нейкі Васільеў і рэкамэндаваў сябе машыністым з Кітайска-Ўсходняй чыгункі. Яго з радасьцю прынялі, не праверыўшы яго ведаў. Машыністы ў першы-ж выезд разьбіў паравоз і вагоны. Выявілася, што ён нават не разумее сыгналізацыі.

АДМІНІСТРАЦЫЯ НЕ НА МЕСЦЫ

Працоўная дысцыпліна ў заняпадзе таму, што адміністрацыя на гэта не зварачае ніякай увагі. Прафсаюзныя арганізацыі імкнуцца змагацца з парушэньнямі дысцыпліны, але гэтаму перашкаджае бязьдзейнасьць адміністрацыі. Зьнятых з работы на транспарце за п'янства і прагулы адміністрацыя зноў прымае на работу.

Зараз паўстае пытаньне: чаму бываюць пробкі, чаму ня выконваюцца вымяральнікі, чаму дрэнна робіцца рамонт, чаму так многа здарэньняў.

Адказ адзін: **на вузьле няма кіраўніцтва, адміністрацыя не скарыстоўвае сваіх праў.** Адзіначальлем і ня пахне. Дыспэтчарскі апарат разваліваюцца з-за п'янства работнікаў. Дыспэтчарам працуе нейкі Эборт, які ўжо аддаены пад суд за шкодніцтва. І зараз ён, будучы п'яным, зьбірае на вузьле ўсе прыбываючыя таварныя цягнікі, трымае іх да прыходу пасажырскіх і пасьля гэтага толькі пачынае апраўляць таварныя. Зразумела, што могуць быць усякія здарэньні.

Аршанскі вузел—хворы. Кіраўніцтва яго культае на абедзьве нагі. Патрэбны самыя тэрміновыя меры, каб падрыхтаваць вузел для сур'ёзнага экзамэну, які ён павінен здаваць у самы бліжэйшы час.

А. Мілашэўскі і Я. Пракаповіч.

У Смалявіцкім раёне абкладаюць калгасьнікаў

У мэтах узмацненьня калгасаў і росту калектывізацыі, урад устанавіў рад ільгот калгасам і калгасьнікам. У прыватнасьці, даны рад ільгот у галіне падаткаваньня. Гэтыя ільготы маюць выключна важнае палітычнае значэньне. На фінапарат ускладзена адказная задача правесьці ў жыцьцё закон аб ільготах, ні ў якім разе не дапускаць перагібаў у абкладаньні.

Між тым абсьледваньне ходу абкладаньня сельгаспадаткам па Смалявіцкім раёне выявіла, што па трох сельсаветах Забалоцкім, Жодзінскім і Смалявіцкім ня вызвалены ад сельгаспадатку і атрымалі акладныя лісты нават тыя калгасьнікі, якія да ўступленьня ў калгас былі вызвалены ад падатку, як беднякі.

Фінчастка Смалявіцкага райвыканкому праявіла недапушчальнае галавацяпства ў гэтай справе, недаацаніла палітычнага значэньня гэтага мерапрыемства. У выніку беднята, якія ўвайшлі ў калгасы, не атрымала належных ільгот.

Паводзіны фінчасткі зьяўляюцца грубым скажэньнем падатковай палітыкі, вынікам агіднай палітычнай блізарукасьці.

Народны камісар фінансаў БССР абвясьціў загадчыку Смалявіцкага раённага фінаддзелу т. ХАДЫКА суровую вымову.

Б.

ДА АДКАЗНАСЬЦІ

за затрыманьне ўзносаў па пазыцы

Праведзеная гэтымі днямі абсьледваньне выявіла злачынныя адносіны кіраўнікоў некаторых устаноў да справы рэарганізацыі пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады. Гэтыя ўстановы затрымлівалі грошы, унесеныя супрацоўнікамі ў пагашэньне ўзносаў па пазыцы, і не перадавалі іх па прызначэньні.

Калектыў рабочых і служачых беларускага аддзяленьня Цэнтравыдавецтва падпісаўся на пазыку на 1.095 руб.

17-га жніўня яны ўнесьлі першы ўнос у суме 52 руб. У другі раз з іх было атрымана 55 руб. Грошы і па гэты дзень ляжаць на рахунку выдавецтва і ня зданы па прызначэньні. На запытаньне абсьледвацеляў, чаму грошы марынуюцца і не здаюцца ў Дзяржбанк, бухгалтар Гельдзінг адказаў: «Бачыце, мы ня ведалі, як накіраваць гэтыя сродкі, бо наяўных грошай мы ня маем, утрыманыя ўзносы знаходзяцца ў Дзяржбанку на нашым рахунку». Як бачыце, Выдавецтва каля месяца карыстаецца сродкамі пазыкі для сваіх гаспадарчых патрэб.

Цэнтральнае праўленьне саюзу друкароў па калектыўнай падпісцы ўтрымала ад падпісчыкаў яшчэ 1-га верасьня 49 р. 50 к. Дагэтуль грошы ляжаць на рахунку ЦП і не здаюцца па прызначэньні.

Аб усім гэтым складзены адпаведныя акты.

Менская гарадзкая камісія садзейнасьці дзяржкрэдыту, разгледзеўшы гэтыя акты, пастанавіла перадаць справу менскаму пракурору для прыцягненьня адміністрацыі беларускага аддзяленьня Цэнтравыдавецтва і ЦП саюзу друкароў да судовай адказнасьці.

ЗАМЕСТ ПРЫЛІВУ—АДЛІЎ СРОДКАЎ

Дырэктывы аб мабілізацыі сродкаў насельніцтва дрэнна выконваюцца гаспадарчымі арганізацыямі.

Па Менскай ашчаднай касе за 6 дзён верасьня паступіла 1.663 р. новых укладаў, адліў-жа фізычных укладаў складае 9.877 руб.

МЦРК самаўласна зьменшыў заданьне Белкаапсаюзу аб мабілізацыі сродкаў ад 560.000 да 378.000 руб. Заданьне аб паянакапленьні выканана на 58,6 проц.

Яшчэ горш стаіць справа з паступленьнем авансаў пад тавары.

Паступіла толькі 1.100 руб. (сюды ўваходзяць грошы за абанэмэнты на абеды).

Менселькрэдыт сарваў заданьне аб паянакапленьні. Замест прыліву ёсьць адліў паёў на 0,1 проц.

БІРШТЭЙН.

ЖАКТЫ НЯ ЎЖЫВАЮЦЬ БЕЗНАЯЎНЫХ РАЗЬЛІКАЎ

Паводле пастановы НК-РСІ, Беларускаю навінен быў увесьці з 1-га мая безнаяўныя разьлікі з паймальнікамі кватэр за камунальныя паслугі.

Пастанова гэта нязыканана. Пераход на безнаяўныя разьлікі па г. Менску праведзены значна пазьней, чым запланавана, ды і тое не па ўсіх ЖАКТ'ах.

Па Гомелі прыступлена да гэтай справы толькі з ліпеня. Па іншых акругах нічога ня зроблена.

Культкамісіі ЖАКТ'аў і прафарганізацыі не растлумачылі жыхаром ЖАКТ'аў значэньня безнаяўных разьлікаў; у выніку жыхары, якія зьяўляюцца ўкладчыкамі ашчадкас, не карыстаюцца правамі жыра-загаду.

Ашчадкасы несвачасова перасылаюць жыра-паведамленьні як ЖАКТ'ам, так і платнікам.

ЖАКТ'ы павінны неадкладна перайсьці на безнаяўныя разьлікі.

Т.



Запруда Днепраоуду

З лістоў рабселькораў

УДАРЫЦЬ ПА ГАЛАВАЦЯПАХ

Зараз надзвычай шмат увагі аддаецца пытаньню рабочага забесьпячэньня. **Галавацяпы** ў паасобных арганізацыях зрываюць гэта мерапрыемства. Прыёмшчык **Белплодагародніны — Лазарэвіч**, які ўжо зволены з **Белсадсаюзу**, знайшоў сабе месца у **Белплодагародніне** і тут ужо атрымаў некалькі вымоў за п'яства і нядбайныя адносіны да сваіх абавязкаў. У саўгасе **«Тарасава»** выбрана 3 вагоны капусты, якая ўжо 4-ты дзень гніе на вуліцы, а нам. дырэктара **Плодагародніны—т. Хавіч** не зварачвае на гэта ўвагі, кажучы, што **«на днях высьветлім»**.

Трэба каму належыць на гэткія злоўжынні рэагаваць.

П—ко.

КАЛГАСЫ ЗДАЮЦЬ ХЛЕБ

З 20 жніўня г. г. некаторыя калгасы **Дубровенскага** раёну, не чакаючы заданьняў па хлебазагатоўках, першыя прывезьлі чырвоныя абозы хлеба. Калгас **«Чырвонае Пабярэжжа»** прывёз **2 тоны** (калгас з **8 гаспадарак**); калгас **«Маяк»—2,4 тоны** (таксама **8 гаспадарак**); **«Чырвонал Паляна» — 5,7 тоны**, **«Іскра»—1,5 тоны**. Рэшта калгасаў таксама рыхтуецца хутка здаць таварныя лішкі хлеба.

Такім чынам, кулацкія прароцтвы аб тым, што калгасы **(Дубровеншчыны)** зусім не ўбяруць збожжа і нічога дзяржаве не здадуць, **не апраўдаліся.**

КАЗАРЭЎСКІ П.

ПАРУШЫЦЕЛІ ПРАФСАЮЗНАЙ ДЭМАКРАТЫІ

25/VIII г. г. адбыўся сход рабочых і служачых **Асінторфу (Аршаншчына)**, на якім разглядалася шмат пытаньняў. Але галоўнае ўвагі заслугоўвае апошняе пытаньне—**прыём у профсаюз.** Рабачком, у асобе тав. **Церахоўскага**, прадставіў на зацьвярджэньне сходу членамі саюзу кандыдатуры 28 асоб. З боку членаў саюзу былі прапановы—з прычыны позьняга часу адкласьці гэтыя пытаньні на наступны сход. З гэтым тав. **Церахоўскі** не згадзіўся і для паскарэньня справы запрапанаваў сходу галасаваць не паасобку, а разам і без усякага абгаварэньня кандыдатур на сходзе. Супроць такога прыёму пярэчылі члены саюзу, якія даводзілі, што такі мэтад прыёму ў саюз не адпавядае саюзнай дэмакратыі. Усе гэтыя кандыдатуры былі кандыдатурамі сэзоньнікаў і іх трэба было абгаварыць у паасобку.

Не палічыўшыся з гэтым, **Церахоўскі** перагаласаваў цалкам сьпіс з **28 асоб.** У лік 28 увайшлі асобы, якіх амаль зусім ня ведалі члены саюзу, што прысутнічалі на сходзе. У галасаваньні ўдзельнічалі тыя, каго прымалі і нячлены саюзу. Пры гэтым, у пратаколе было зафіксавана—прыняць сьпіс аднагалосна Члены саюзу былі абураны гэткім мэтадам прыёму ў саюз. Гэткі мэтад прыёму ў саюз неабходна адкінуць, а рабачкому трэба пазнаёміцца са статутам **прафсаюзу.**

Правая рука ня ведае, што робіць левая

Інструктару Белторфаб'яднаньня Тэвелеву вельмі не спадабаўся загадчык торфараспрацовак пры заводзе «Камінтэрн» т. Бажанаў.

У красавіку месяцы пры перадачы гэтага вучастку Белторфу, Шэвелеў самастойна зьняў т. Бажанава з работы і запрапанаваў яму перадаць вучастак іншаму таварышу. На пратэст т. Бажанава, Тэвелеў адказаў: «Я ведаю, што раблю і за свае распараджэньні адказваю».

Такім чынам, т. Бажанаў, які ў свой час скончыў курсы тарфянікаў, працаваў некалькі год на вучастку і апошні час прыёму аб'яднаных торфараспрацовак Белторфам быў названы кіраўніком распрацовак—прымушаны быў здаць вучастак.

Справу разглядаў Бабруйскі нарсуд 1-га вучастку. Прадстаўнік адміністрацыі імкнуўся давесьці, што Бажанаў зьняты з работы за невыкананьне прамфінпляну.

Нарсуд да вырашэньня справы падыйшоў правільна і ўстанавіў, што прамфінплян быў ня выкананы з прычыны несваячасовай дастаўкі торфмашыны. Акрамя гэтага машыны былі папсаваныя. Паміж Тэвелевым і Бажанавым былі асабістыя рахункі. Суд пастанавіў адмавіць Бажанава на разбор з выплатай розьніцы ў зарплаце.

Кіраўнік Белторфу згадзіўся з пастановай нарсуду і прызнаў, што Бажанаў быў няправільна зьняты з работы. Нават 5-га верасьня кіраўнік паведаміў працаўніку рэдакцыі, што Тэвелеў на звальненьне ня меў ніякіх даручэньняў.

Здаецца, справа вырашана. Засталося толькі за перавышэньне ўлады і цяганіну прыцягнуць да адказнасьці інструктара Тэвелева.

Між тым, таго-ж 5-га верасьня Бажанаў атрымаў адбітак адносіны Белторфу ад 21 жніўня ў Вярхоўны суд. Падпісаў адносіну намесьнік кіраўніка Маеўскі. Белторф просіць Вярхоўны суд справу Бажанава перагледзець з тае прычыны, што Бажанаў на службе ў Белторфе не знаходзіўся.

Хто вінаваты, хто мае рацыю, скажа пракуратура, але на сутнасьці—справа агідная.

РСІ і пракуратура павінны высьветліць і прыцягнуць да адказнасьці ня толькі вінаватых у цяганіне, але і тых, хто вінаваты ў несваячасовай дастаўцы і ў папсаваньні тарфяных машын.

П.

ФРУНЗАЎСКІ РК МОПР'у

арганізуе 15-га верасьня а 7 гадз. увеч. у клюбе харчавікоў

ВЕЧАР СУСТРЭЧНАГА ПРАМФІНПЛЯНУ.

З дакладам выступіць сакратар ЦК МОПР'у БССР т. **Калмык.** Пасьля дакладу—канцэрт. Білеты ячэйкі МОПР'у атрымліваюць у райкоме (Савецкая, 87) ад 7 да 9 гадз. увеч. 13 і 14 і ад 10 да 4 г. дня 15 верасьня.

МЕНСК

У Саўнаркоме БССР

Школы калгаснай моладзі. СНК згадзіўся з прапановай Наркамасьветы аб рэарганізацыі школ сялянскай моладзі ў школы калгаснай моладзі. Наркамасьветы даручана распрацаваць сетку школ калгаснай моладзі ў адпаведнасьці з асноўнымі напрамкамі гаспадаркі ў раёнах.

Інтэрнаты для студэнтаў. СНК абавязаў Белдзяржбудаб'яднаньне скончыць да 1 кастрычніка пабудову інтэрнату для студэнтаў Беларускай с.-г. акадэміі ў Горках. Будаўніцтва галоўнага корпусу павінна быць скончана ў будучым сэзоне.

Прыгарадныя гаспадаркі. СНК запрапанаваў 12 гарсаветам прыняць удзел у фінансаваньні прыгарадных гаспадарак спажывецкай кааперацыі на агульную суму ў 125.000 руб. Менскі гарсавет павінен адпусьціць 28.000 руб., гомельскі і віцебскі — па 18.000 руб. і г. д.

Камітэт садзейнасьці саматужнай прамысловасьці. Зацьверджаны склад камітэту садзейнасьці саматужна-прамысловай кааперацыі пры Экана БССР. У камітэт уваходзяць прадстаўнікі 8 арганізацый.

Падарункі да XIII гадавіны кастрычніка

Канчаецца пабудова новых прадпрыемстваў

У Рэчыцы да 7-га лістапада канчаецца пабудова першага ў Саюзе заводу дубільнага экстракту «Дубіцель». Пуск заводу значна скароціць імпарт экстракту за гарбарань.

Завод будзе мець уласную электрастанцыю, якая дасьць ток таксама і гор. Рэчыцы да пуску другой раённай электрастанцыі.

Да 13-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі прыстасоўваецца таксама пуск першай на Беларусі фабрыкі штучнага валакна ў Магілеве.

КЛЮБНАЕ БУДАЎНІЦТВА Ў БССР

Прэзыдыум ЦСПСБ абгаварыў пытаньне аб клюбным будаўніцтве. Прэзыдыум адзначыў зрыў будаўніцтва клюбаў у 1930 годзе з-за несваячасовага зацьвярджэньня праектаў будаўніцтва (ЦП хэмікаў, дрэваапрацоўшчыкаў), несваячасовай загатоўкі і падвозу матар'ялаў. Прэзыдыум пастанавіў паскорыць тэмпы будаўніцтва.

Прэзыдыум прызнаў неабходным закончыць у 1930-31 г. пабудову клюбу хэмікаў у Рэчыцы, зрабіўшы яго клюбам прафсаюзаў хэмікаў, мэталістых і дрэваапрацоўшчыкаў, клюбу швейнікаў у Віцебску, будаўнікоў у Менску, дрэваапрацоўшчыкаў у Бабруйску. Павінны быць распачаты ў 1931 г. пабудовы клюбаў гарбароў у Менску коштам у 370.000 руб., швейнікаў у Менску—300.000 руб. і клюбу папернікаў у Чашніках—200.000 руб. Усяго, паводле пяцігадовага пляну, павінна быць пабудавана 15 клюбаў.

ЗА ДЗЕНЬ

— Заняткі ва ўсіх школах па ліквідацыі няпісьменнасьці ў г. Менску пачнуцца 20 верасьня.

— 20 верасьня ў Менску адбудуцца міжсаюзныя тэнісныя сустрэчы Менск—Віцебск.

— У хуткім часе ў Ленінградзе адбудзецца сустрэча на тэнісу паміж менскай тэнісная прафсаюзная камандай і ленінградзкай.

— Усе школы-сямігодкі ў гэтым годзе, у зьвязку з палітэхнізацыяй школ, прымацаваны да прадпрыемстваў. Вучні школ будуць праводзіць ліквідацыю напісьменнасьці сярод рабочых і дапамагаць культурнай рабоце прадпрыемстваў.

— Рабочы тэатр ЦСПСБ упора вылехаў для культурнага абслугоўваньня манэўраў.

— У апошніх лічбах верасьня пры ЦСПСБ склікаецца пашыраны пленум бюро фізкультуры ЦСПСБ з удзелам прадстаўнікоў усіх бюро фізкультуры пры ЦП саюзаў, гарпрафсаветах і райпрафсаветах.

— Прыём у аб'яднаную беларускую ваенную школу будзе праводзіцца з 1 па 12 кастрычніка.

Перад прызывам

Падрыхтоўчая работа да чарговага прызыву 1908 году ўжо скончана. Па ўсіх прадпрыемствах Менску былі праведзены сходы і гутаркі з прызыўнікамі. Пры менскім ваенкамаце арганізуецца агітпункт, дзе будуць праводзіцца гутаркі, чытка газэт, кніг з прызыўнікамі. Наладжваецца таксама пір, дзе кожны прызыўнік будзе мець магчымасьць вучыцца страляць. Да пачатку прызыву засталося 4 дні.

Рэарганізацыя судоў БССР

Прэзыдыум ЦВК БССР зацьвердзіў праект пастановы аб пашырэньні праў народных судоў у зьвязку з ліквідацыяй акруг.

Згодна пастановы, значна пашыраецца кампетэнцыя народных судоў і правы вучастковых пракураў. Народны суд разглядае ўсе крымінальныя і грамадзянскія справы, апрача спраў, падсудных Вярхоўнаму суду, таварыскім і сельскім судам.

Судовая Калегія Вярхоўнага суду разглядае крымінальныя справы, па якіх прадугледжана вышэйшая мера пакараньня, а таксама правы пэрсанальнай падсуднасьці. Усе правы і абавязкі акруговага пракурора перадаюцца вучастковым і гарадзкім пракурорам.

Дастаўка дроў на дом

Прэзыдыум гарсавету запрапанаваў МІРК безадкладна павялічыць свой транспарт да 50 фурманак для дастаўкі дроў на дом. Адначасова гарсавет просіць ВСНГ даць распараджэньне прадпрыемствам аб тым, каб яны прадаставілі свой транспарт для дастаўкі дроў пайшчыкам на дом пасьля 4-х гадзін дня.

Паход за грамату

Прэзыдыум Гарсавету зацьвердзіў план правядзеньня месячніка культпаходу за грамату. Усім гаспадарчым, кааперацыйным і савецкім установам запрапанавана прадаставіць усе вольныя памяшканьні (канцылярыі, габінэты і г. д.) для работы лікпунктаў і школ малапісьменных. Створаны спэцыяльны штаб для правядзеньня паходу.

Што новага на ўсебеларускай выстаўцы

— Гэтымі днямі распачалася ўзорная малацьба аўсу, сабранага з палёў Усебеларускай выстаўкі.

— З саўгасаў калгасаў Меншчыны выбрана лепшая жывёла для папаўненьня экспанатаў павільёнаў жывёлагадоўлі. У прыватнасьці, племяныя гаспадаркі Русанавічы і імя Калініна папоўнілі групу чырвонай рагатай жывёлы.

— 9-га верасьня на тэрыторыі выстаўкі быў праведзены дзень калектывізацыі. На агульным сходзе ў тэатры выстаўкі з дакладам выступіў прадстаўнік Белкалгасцэнтру. Даклад трансьляваўся па радыё.

— Штодзенна а 1-й гадзіне ля павільёну коньводзтва ўтвараюцца бягі. У бягох прымаюць удзел рысакі і скакуны дзяржаўных конзаводаў (Прудкаўскага і Буйніцкага) і калгасаў.

— Увесь час ідзе прыцёк новых экспанатаў у павільён садоўніцтва і агародніцтва.

— На працягу апошніх пяці дзён Усебеларускую выстаўку аглядаў пастаянны прадстаўнік Узьбекскай ССР пры ўрадзе СССР т. Турсун Хаджаеў.

Шкодніцтва на хлебазаводзе

Мы ўжо некалькі раз паведамлялі аб шкодніцтве на Менскім хлебазаводзе. За апошні час выяўлены новыя факты шкодніцтва.

Майстар хлебазаводу **Грыбоўскі** наўмысьля сапсаваў 54 пуд. хлеба і, каб утаіць сваё злачынства, на вынечаны хлеб ніякіх штампаў ня ставіў, у той час, калі гэта павінен зрабіць кожны майстар.

На апошнім сходзе рабочых заводу, дзе разглядалася гэта пытаньне, Грыбоўскі зьняты з работы і выключаны з саюзу.

Сьледзтва па гэтай справе скончылася. Грыбоўскі ўзяты пад варту.

НА СХОДЗЕ БелАПП'у

Заўчора, 10-га верасьня, у Доме Пісьменьніка пад старшынствам **т. Александровіча** адбыўся адкрыты сход менскай філіі БелАПП'а разам з прадстаўнікамі нацыянальных сэкцый і членамі цэнтральнае рабочае студыі.

На парадку дня сходу стаяў рад вельмі важных пытаньняў: аб цяперашнім становішчы і пэрспэктывах далейшае працы БелАПП'у, творчай дыскусіі ў РАПП'е і інш.

З дакладам па першым пытаньні выступіў **т. Ліманоўскі.** Ён заначаў, што побач з вялікімі дасягненьнямі БелАПП'у, з моманту яго першага зьезду, у галіне замацаваньня пазыцый у барацьбе за гегемонію пралетарскай літаратуры, апошнія часы даводзяць пэўнае запізненьне ў творчай і арганізацыйнай рабоце асацыяцыі.

БелАПП не завастрыў увагі грамадзкасьці на змаганьне з варожымі, нацыянал-дэмакратычнымі плынямі ў беларускай літаратуры, не займаўся падрыхтоўкаю літаратурных кадраў з рабочага асяродзьдзя, ня вёў сыстэматычнае выхаваўчае работы ўнутры аб'яднаньня, вынікам чаго зьявіліся праявы багэмшчыны і бытавога разлажэньня паасобных беларапаўцаў. Сакратарыят БелАПП'у даўным даўно агубіў сувязь з акруговымі філіямі і тыя, за выключэньнем хіба бабруйскае і гомельскае фактычна спынілі сваё існаваньне.

Тав. Ліманоўскі зьвярнуў увагу на арабочаньне асацыяцыі, як асноўнае ў перабудове радоў БелАПП'а ў зьвязку з новымі адказьнейшымі задачамі, якія паўстаюць перад беларускай і нацменаўскай пралетарскай літаратурай на сёньняшні дзень.

Выступленьні ў спрэчках па справаздачным дакладзе сакратарыяту іншы пад знакам шырокае дзелавое самакрытыкі недахопаў. Шкада толькі, што прамоўцаў знайшлося ня вельмі многа. Між тым, як самі беларапаўцы, самі пісьменьнікі, павінны былі-б выступіць, даць адказ грамадзкасьці аб прычынах творчага застою.

Таварышы **Галавач, Бэрнштэйн, Кучар, Паўлоўскі** адзначалі дрэнную дапамогу пачынаючым пісьменьнікам па лініі кансультацыйнага бюро і рэдакцыі часопісі «Маладняк», невыстарчальную палітычную падкаванасьць беларапаўцаў, культгадае кіраўніцтва сакратарыятам БелАПП'а літаратурнымі гурткамі на прадпрыемствах.

Асабліва шмат скаргаў выклікае дзейнасьць Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва. Вакол «сіласных ям», дзе марынуюцца гадамі зборнікі пралетарскіх пісьменьнікаў Беларусі, вакол няпісьменных рэцэнзій некаторых рэдактароў, вакол усяе палітыкі бесьперапынных канфліктаў паміж пісьменьнікамі і БДВ завязаліся жывыя, гарачыя спрэчкі. На жаль, у залі ня было прадстаўніка Белдзяржвыдавецтва, які змогбы даць тыя ці іншыя тлумачэньні ў сувязі з зусім слушнымі скаргамі.

Асобна адзначалі выступаўшыя невыстарчальны ўдзел навуковых работнікаў-літаратуразнаўцаў у літаратурным жыцьці БССР, у прыватнасьці—Менску. **Тав. Гальперына** ўнесла прапазыцыю арганізаваць у Доме Пісьменьніка (які зараз па выразу аднаго з таварышоў нагадвае краматоры) тры сэмінары: па дыялектычным матар'ялізьме, мэтадалёгіі літаратуры і тэхніцы творчасьці, а таксама пэрыядычна ставіць даклады навуковых работнікаў-марксыстых для пісьменьніцкае аўдыторыі.

Прамоўцы спыняліся і на матар'яльна-бытавым баку жыцьця беларапаўцаў (утварэньне дому-камуны, закрытага разьмеркавальніка і г. д.).

Гэты сход мае вялікае значэньне. Ён павінен значна ўзварухнуць дзейнасьць БелАПП'а, каб дапамагчы хутчэйшай ліквідацыі «ножніцы» паміж тэмпамі сацыялістычнага будаўніцтва і ростам літаратурнай прадукцыі нашых пісьменьнікаў. А «ножніцы», бязумоўна, ёсьць... Яны балюча адчуваюцца і ў нашай асацыяцыі, і ў ВУСПП'е, і ў РАПП'е.

ЮР. ЛЯВОНЫ.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

Сёньня, 13 верасьня

— Дом Асьветы. А 7 гадз. увеч. адбудзецца па-зачарговы сход калектыву ЛКСМВ працасьветы. Яўка ўсіх камсамольцаў абавязкова.

— Даводзецца да ведама хатніх работніц мясцкому № 2, што сёньня, а 9 гадз. увеч., МК №2 арганізуе паездку ў калгас на адзін дзень для прыёму ўдзелу ва ўборачнай кампаніі. Т. т., у якіх нядзеля выхадны дзень, павінны зьявіцца ў вызначаны час на пасажырскі вакзал.

ЗАЎТРА, 14 ВЕРАСЬНЯ

— Дом Камасьветы. А 11 гадз. ран. адбудзецца раніпнік для парт. і камсам. актыву. Даклад—вынікі V кангрэсу прафінтэрну. Пасьля дакладу—канцэртная частка. Білеты па РК і ў чытальні Дому.

— А 8 гадз. увеч. адбудзецца літаратурна-мастацкі вечар для парт. і камсам. актыву. Білеты ў РК і чытальні.

— **Кастрычн. РК КП(б)Б** склікае 14 верасьня, а 6 гадз. увеч., у памяшк. РК КП(б)Б нараду дырэктароў прадпрыемстваў, загадчыкаў старшынь цэхаў ФЗМК і кіраўнікоў устаноў-партыйнаў і арганізатараў сэктараў вучобы па пытаньні аб палітэхнізацыі школ. Яўка абавязкова і без спазьненьня. За поўную яўку памянёных т.т. адказваюць ускладаецца на сакратароў ячэек КП(б)Б.

— **Т-ва гісторыкаў-марксыстых** паведамляе, што 14 верасьня, а 8 гадз. увеч., у памяшк. Камвузу, адбудзецца пасяджэньне т-ва. Будзе даклад т. Сосіна на тэму: «Яўрэйская гісторыяграфія».

Час. вык. абав. адказ. рэдактара А. МІТЛІН.

КАСТРЫЧНІЦКІ РК МОПР'у

14 верасьня, а 7 гадз. увеч. у клюбе Менгарсавету (пляц Волі),

арганізуе

ВЕЧАР СУСТРЭЧНАГА ПРАМФІНПЛЯНУ.

Дакладчык т. КАЛМЫК. Пасьля дакладу—вялікая мастацкая частка. Білеты ячэйкі МОПР'у атрымліваюць у РК МОПР'у штодзенна ад 6 да 9 гадз. увеч

14-га верасьня а 10 гадз. раніцы ў м-ку **СЬМІЛАВІЧЫ**

АДБУДЗЕЦЦА

раённая канфэрэнцыя рабселькораў Сьмілавіцкага раёну

з абвестнай дня:

1. Пастановы XVI зьезду УсеКП(б) і задачы рабселькораў (дакладчык рэдакцыя «Зьвязды»).
2. Чарговыя задачы раённага друку.

На канфэрэнцыю запрашаюцца ўсе рэдкалегіі насьценных газэт.

РК КП(б)Б

Рэдакцыя «Зьвязды».

Нарада, якая была склікана ВСНГ БССР і Бел. МБІТ на 11 верасьня

ПЕРАНОСІЦЦА на 14 верасьня

а 7 гадз. увеч. у клюбе саўгандальспужачых.

У ПАРАДКУ ДНЯ:—

Даклад аб выкананьні прамфінпляну за 1929-30 г. і падрыхтоўка да 1930-31 г. Дакл. т. ГЕЙ На нараду павінны зьявіцца: кіраўнікі і нам. кір. аб'яднаньняў і прадпрыемстваў г. Менску, інжынэры і адм.-тэхнічны пэрсанал, майстры, старэйшыя па цэхах.

Запрашаюцца прадстаўнікі партыйных і прафесыянальных арганізацый, аб'яднаньняў і прадпрыемстваў.

ПЕРШЫ УСЕБЕЛАРУСКІ ПАЛІТЭХНІЧНЫ ЗЬЕЗД

адкрываецца 15-га верасьня а 6-й гадзіне ўвечары

ў памяшканьні Беларускага дзяржаўнага тэатру.

Пасяджэньне францы КП(б)Б—а 5-й гадз. увечары ў малай залі клюбу Карла Маркса (уваход з вул. Энгельса).

Рэгістрацыя дэлегатаў і выдача мандатаў адбываецца ў памяшканьні Дому Асьветы (Камуністычная, 19) 14-га верасьня з 12 гадз. ран. да 10 гадз. увечары і 15-га з 6 гадз. ран. да 4 гадз. дня.

На вакале 14-га і 15-га дэлегатам зьезду валежыць аварочвацца да дзяжурнага арг. к-ту (у памяшканьні бюро выстаўкі).

Тэлефоны арг. камітэту: 11—47, 14—12, 4—37.

Старшыня Арг. Камітэту Нарком Асьветы **А. Платун.**

У ПАХОД ЗА ПАПЕРУ

ЧАРГОВАЕ

Сёньня 13-га верасьня

ПАШЫРАНАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ

Бел. Штабу „у паход за паперу"

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Інфармацыі вызваных брыгадзіраў. 2. Аб першым масавым паходзе па Менску. На пасяджэньне павінны зьявіцца **т. т. Херыш** (Белпадвора), **Нотэо** (ЦП друкароў), **Бабушкін** (Белуціль), **Мутэр** (Белдзяржгандаль), **Пайкін** (БКС), **Браўэрман** («Рабочий»), **Міркаў** («Сав. Бел.»), **Таганская** («Чырв. Зьмена»), **Крукоўскі** (Белжылсаюз).

Запрашаюцца сакратары Райкомаў ЛКСМБ, старшыні РБ ДКА, прадстаўнікі РСІ, Цэнтрархіву і інспэктар асьветы.

Пачатак роўна а 4 гадз. дня

Пасяджэньне адбудзецца ў памяшк. рэд. «Зьвязда».

БЕЛ. ШТАБ.

ЦП саюзу друкароў паведамляе, што спэктакль балету

ДУНКАН,

які быў перанесены на 13 верасьня,

СЁНЬНЯ НЕ АДБУДЗЕЦЦА

Білеты вярнуць у фабкомы.

Мастацкі **ЦЫРК** | Пад кіраўніцтвам І. Л. СТРАШЭВІЧА

СЁНЬНЯ, 13 верасьня.

НОВАЯ ПРАГРАМА

Стайня муштраван. коняй **Дзіэсідорфа**
Муштроўчыца галубоў і сабак **Н. Кісс.**
Чалавек-фантан **Гатамо**
Жывая рахунковая машына **Аляксандар Хэйфец.**
Артыстыя балету **Мейсевка і Поль** | Японскі артыст **Осадо** | Вэнтрылёг **С. Баброўскі**
Музычныя сатырыкі **Біб-Боб**
Зусім новы рэпэртуар.
Ля дыванў увесь вечар **Флік-Флак.**
— Пачатак а 8 г. 30 м. —
Адказны кіраўнік І. Л. СТРАШЭВІЧ.

Кіно-тэатр **„Культура"** — Мастацка-гістарычны фільм **ЗАЎТРА УНАЧЫ** Пабег 10 сьмертнікаў з варшаўскай турмы. **Каса адчынена ад 5 г.** Пачатак сэансаў: 7 г., 8 г., 40 м., 10 г. 20 м

КІНО **Інтэрнацыянал** — Мастацкі фільм паводле тэмы П. І. ТРЫФОНАВА **СОРАМНА СКАЗАЦЬ** Драма ў 6 частках. **Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз.** Каса—ад 5 гадз.

КІНО **„Пралетары"** — Сусьветны фільм **Браняносец Пацёмкін** Пачатак 1-га сэансу а 7 г. Каса адкрыта ад 5 гадз.

Дзіцячы кіно-тэатр **„Юны піянэр"** — Пачатак 1-га сэансу а 2 г. дня. Каса адкрыта з 12 гадз.

Кіно **„СПАРТАК"** — З прычыны вялікага посьпеху **2-гі тыдзень 2-гі** дэманструецца нашумеўшы фільм **ВАР'ЕТЭ** драма ў 7 частках. Пачатак сэансаў: **7 г., 9 г., 10 г. 45 м.** КАСА—ад **6 гадз.**

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР

„АВАНГАРД" 13, 14 верасьня п'еса ў 4-х дзеях. **В. Катаеў.**

Пастаноўка С. Разанава і К. Саньнікава. Мастак Ю. Гольц. Музыка В. Салалова. Дырыжэр І. Гіттарц. Кіраўнік хору М. Кауфман. Паказ вядзе С. Калпашнікаў.

Пачатак роўна а 8 з пал. гадз. | Білеты прадаюцца ў касе тэатру, у рабочай касе і на Усебеларускай выстаўцы.

ПРЫЁМ на вытворчую, гандлёва-кааперацыйную і статыстычную групы **Курсаў АРУ** *прадоўжаны да 18 верасьня.*

Усе зацікаўленыя ўстановы і прадпрыемствы павінны да гэтага тэрміну прысылаць сьпісы камандируемых імі рахункових і статыстычных працаўнікоў. Падрабязныя даведкі ў канцылярыі АРУ (Савецкая 65, тэл. № 195).

ГАЛОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА ШОСАВЫХ І ГРУНТАВЫХ ДАРОГ І АЎТАТРАНСПАРТУ БССР

абвяшчае прыём заяў

У Гомельскі дарожна-будаўнічы тэхнікум

(рэарганізаваны III канцэнтр чыгуначнай школы).

Прыём на агульных падставах, згодна даведніка НКАсьветы.

Частка студэнтаў забясьпечваецца стыпэндыяй і інтэрнатам.

Заявы прымаюцца **да 20 верасьня** канцылярыяй тэхнікуму ў **г. ГОМЕЛІ, пасёлак „Чырвоны Кастрычнік", будынак чыгуначнай школы.**

ГАЛОЎДАРТРАНС БССР.

ПОДПИСЫВАЙТЕСЬ НА МАССОВЫЙ

РОСТ ЛИТЕРАТУРНО-ХУДОЖЕСТВЕН. КУЛЬТУРНО-БЫТОВОЙ ЖУРНАЛ

Орган Всерос. и Всесоюзн. Асоц. Пролетарских Писателей.

В журнале печатаются новые повести, рассказы, стихи пролетарских и советских писателей.

РОСТ отзывается на все явления культурной жизни Советского Союза, подробно знакомит с ними своих читателей и организует борьбу за культурную, революцию, за новую литературу, культуру и быт. Боевой орган культурной революции,

РОСТ богато иллюстрируется фотографиями, рисунками и карикатурами.

Каждый интересующийся вопросами пролетарской литературы, вопросами культуры должен быть читателем и подписчиком „РОСТА"

Со 2-го полугодия 1930 г. „РОСТ" издается Акцион. Издат. О-вом „ОГОНЕК" ВЫХОДИТ ДВА РАЗА В МЕСЯЦ.

Подписная цена: на 6 м.—12 ном.—1 р. 50 к., на 3 м.—6 ном.—75 к

ПОДПИСКА ПРИНИМАЕТСЯ Акц. Изд. О-вом „ОГОНЕК"—МОСКВА, 6. Страстной бульвар. 11, всеми почтовыми отделениями, письмоносцами и в мел.-дор. газетных киосках.

УСЕ ДАВЕДКІ

па любым пытаньні

ДАЕ БЮРО ОБСЛУГОЎВАНЬНЯ

БЕЛАРУСКАГА КІРАЎНІЦТВА СУВЯЗІ.

Даведкі можна атрымаць вусна, пісьмова, па тэлефону і тэлеграфу.

ДЛЯ АТРЫМАНЬНЯ ДАВЕДАК ПА ТЭЛЕФОНУ

неабходна стаць абанэнтам бюро даведак.

Па пытаньні абаняваньня званеце па **тэл. 12-47.**

Бюро працуе з 9 да 20 гадз. Менск, Ленінская, 34, будынак пошты.

БЮРО АБСЛУГОЎВАНЬНЯ прымае заказы **на ГАЗЭТНЫЯ ВЫРАЗКІ** з усіх газэт і часопісяй СССР і замежнага друку.

Выразкі высылаюцца па ўсіх бяз выключэньня пытаньняў.

Самую лепшую і правільную інфармацыю па пытаньнях, якія вас цікавяць, вы атрымаеце праз бюро газэтных выразак.

Падпісвайцеся на газэтныя выразкі!

Для прыёму заказаў званеце па **тэл. 12-47.**

Згубленыя і украдзеныя дакументы

лічыць несапраўднымі:

Паявая кн. № 787 Ульчыца Я. П., выд. Радашкоўск. спаж. т-вам 967
Вуч. карт. Аскерка П. Г., выд. Барысаўск. ваенкаматам 968
Пасьведч. аб сканч. 7-годкі Раута В. В. 969
Пашп. № 204 Красуцкай Я. Ю., выд. Талачын. адм. аддз. 970
Даведка Швэдзіка Г. В., выд. Мен. ЦРП 971
Вайск. кн. № 247 Кароткага М. Л. 972
Чл. біл. саюзу чыгуначн. № 26862, пасьведч. № 6/н Негерэвіча Н. А. 973
Парт. біл. Старасьценка Е. Ф. 974
Пашп. Пацэвіч А. І., выд. Ушацк. сельсаветам 975
Страх. кн. Анташкевіча К., выд. Талачын. страхкасай 976
Вайск. кн. Макарэвіча М. Н. 977
Канд. біл. № 24052 Краменскага У. А. 978
Паявая кн. Каплана Л. Г., выд. Бягомльск. спаж. т-вам 979
Асабов. пасьведч. № 86 Іванова А. В. 980
Мэтр. вып., выд. Смалявіцк. РВК, даведка аб выбарч. правох, прафбіл. Ходас Ф. 981
Паявая кн. Хасеневіча А., выд. Пухавіцк. спаж. т-вам 982
Вуч.-конск. карт. Музычанка З. 983
Асабов. карт. № 14 Каплана Я. С., выд. Нараўлянск. РВК 984
Вуч.-конск. карт. Кваціпскага Я. Я., выд. Лепельск. РВК 985
Паявая кн. № 786 Бяхонька Н. А., выд. Якімавіцк. спаж. т-вам 986
Вайск. біл., выд. Слуц. ваенкаматам, чл кн. № 423 Дубіка Я. Ф. 987
Вайск. карт. Цалко П. І., выд. Нараўлянск. РВК 988
Паявая кн. № 4868 Мазавец О., выд. Бярэзінск. спаж. т-вам 989
Паявая кн. Валчка М., выд. Бярэзінск. спаж. т-вам 990
Вайск. кн. Багрова Ф. Г., выд. Чавуск. РВК 991
Паявая кн. Мураўскага Х., выд. Каменаборск. спаж. т-вам 992
Чырвонаарм. кн. Навіцкага В. А., выд. 4 п. 993
Вайск. біл. Мядзеля Н. С., выд. Сакалішчанск. сельсаветам 994
Вуч.-конск. кн. Бондарава М. М., выд. Расонск. РВК 995
Наборн. кн. № 231 Сушко П. І., выд. Талачынск. чыг. каап. 996
Мэтр. вып. Мельнікава О. В., выд. Чавуск. міліцыяй 997
Пашп. Смалякова М. М., выд. Чавуск. міліцыяй 998
Пашп. Анціпенкава М. К., выд. Чавуск. міліцыяй 999

Абвестка

Паводле генэральнай умовы з Усерасійскім Тэкстыльным Аб'яднаньнем, якая робіцца на 1930-31 гаспадарчы год,

спажывецкая кааперацыя прымае на сябе забесьпячэньне тэкстыльнымі таварамі

ўсякага роду інтэрнатаў для рабочых прамысловых прадпрыемстваў, саўгасаў, калгасаў, інтэрнатаў для вучняў, дзіцячых садоў, дамоў, пляцовак, ясьляй і г. д., таксама забесьпячэньне клюбаў і ўсякага роду сталовак і кухань як пры інтэрнатах, так і нарахарчу.

Усе арганізацыі, якія знаходзяцца на бюджэце Наркамаховы Здароўя, Наркамунутраных Спраў, Наркамасьветы, Пустраха і Наркамсабеса спажывецкай кааперацыяй не забясьпечваюцца.

У сувязі з гэтым **Белкаапсаюз** просіць усе вышэйназваныя зацікаўленыя арганізацыі БССР прыслаць свае **заяўкі на патрэбную кольькасьць тэкстыльных тавараў на 1930-31 гаспад. год.**

Заявы павінны складацца ў колькасным выразе (штук, мэтраў) са строгім вучотам сапраўднай гадавой патрэбнасьці, з разьбіўкай па квадрах з паказаньнем, праз якоэ Райспажмуў-таварыства або ПРК пажадана атрымаць патрэбны тавар.

Тавары, неабходныя для вытворча-тэхнічных мэт, а таксама прозвопраткі і спэцвопраткі ў паказаных заяўках ні ў якім разе не павінны быць уключаны. Заяўкі павінны быць прадстаўлены Белкаапсаюзу (Менск) **не пазьней 15 верасьня 1930 г.**

Тыя арганізацыі, якія не прадставяць свае заяўкі да паказанага тэрміну, ня будуць уключаны ў плян забесьпячэньня.

ФОРМА ЗАЯЎКІ

Назва арганізацыі і месца знаходжаньня (дакладны адрас)

НАЗВА ТАВАРАЎ	Для якой мэты	Колькасьць на год		I кв.	II кв.	III кв.	IV кв.	Увага
		мэтр.	штук					
Бязь белая		500	—	150	150	100	100	
Коўдры байкав.		—	300	50	50	100	100	

г. д.

БЕЛКААПСАЮЗ

АБВЕШЧАНЫЯ несапраўднымі згубленыя дакументы на імя Эйдэльман, М. Г., Балашкова, М. М., і Балашковай, М. Г.—зн